**РАЗДЗЕЛ I**
**ЯК ПРАВІЛЬНА ЗАПОЎНІЦЬ ЗАЯВУ**

**РАЗДЗЕЛ II**
**АГУЛЬНЫЯ ЗВЕСТКІ**
**2.1** ЮРЫДЫЧНАЯ ПАДСТАВА
**2.2** УМОВЫ ЗНАХОДЖАННЯ ІНШАЗЕМЦАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ РП
**2.3** ПАТРАБАВАННІ ДА ЗАЯВАЎ, ДАКУМЕНТАЎ, АБГРУНТАВАННЯЎ, ПАСВЕДЧАННЯЎ
**2.4** ТЭРМІН РАЗГЛЯДУ СПРАВЫ
**2.5** ПАЎНАМОЦТВА
**2.6** УРУЧЭННЕ ПАШТОВЫХ АДПРАЎЛЕННЯЎ
**2.7** УРУЧЭННЕ ПАСЫЛАК У ВЫПАДКУ ВЫЯЗДУ ЗА МЯЖУ
**2.8** ПАТРАБАВАННЕ ПРЫТРЫМЛІВАЦЦА ТЭРМІНА
**2.9** АЗНАЯМЛЕННЕ З МАТЭРЫЯЛАМІ СПРАВЫ
**2.10** ДЗЯРЖАЎНЫ ЗБОР

**РАЗДЗЕЛ III**
**ПРАДАЎЖЭННЕ ВІЗЫ**
**3.1** УСТАНОВА, ЯКАЯ РАЗГЛЯДВАЕ ЗАЯВУ
**3.2** ПРАДАЎЖЭННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ВІЗЫ
**3.3** ПРАДАЎЖЭННЕ ШЭНГЕНСКАЙ ВІЗЫ
**3.4** ТЭРМІН ПАДАЧЫ ЗАЯВЫ
**3.5** РАШЭННЕ
**3.6** ДАКУМЕНТЫ

**РАЗДЗЕЛ IV**
**ДАЗВОЛ НА ЧАСОВАЕ ПРАЖЫВАННЕ**
**4.1** АБСТАВІНЫ, ЯКІЯ МОГУЦЬ БЫЦЬ ПАДСТАВАЙ ДА ВЫДАЧЫ ДАЗВОЛУ НА ЧАСОВАЕ ПРАЖЫВАННЕ
**4.2** ДАЗВОЛ НА ЧАСОВАЕ ПРАЖЫВАННЕ Ў ВЫПАДКУ НЕЛЕГАЛЬНАГА ЗНАХОДЖАННЯ НА ТЭРЫТОРЫІ РП
**4.3** ДАДАТКОВЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ЗАЯВЫ
**4.4** УСТАНОВА, ЯКАЯ РАЗГЛЯДВАЕ ЗАЯВУ
**4.5** ДАКУМЕНТЫ
**4.6** ЧЛЕН СЯМ’І
**4.7** ТЭРМІН НА ЯКІ ВЫДАЕЦЦА ДАЗВОЛ НА ЧАСОВАЕ ПРАЖЫВАННЕ
**4.8** ПАКІДАННЕ ЗАЯВЫ БЕЗ РАЗГЛЯДУ
**4.9** АДМОВА Ў ВЫДАЧЫ ДАЗВОЛУ НА ЧАСОВАЕ ПРАЖЫВАННЕ
**4.10** АНУЛЯВАННЕ ДАЗВОЛУ НА ЧАСОВАЕ ПРАЖЫВАННЕ
**4.11** ХАДАЙНІЦТВА АБ ВЫДАЧЫ ДАЗВОЛУ НА ЧАСОВАЕ ПРАЖЫВАННЕ Ў ВЫПАДКУ ЗНАХОДЖАННЯ ЗА МЯЖОЙ

**РАЗДЗЕЛ V**
**ДАЗВОЛ НА ПАСЯЛЕННЕ**
**5.1** УСТАНОВА, ЯКАЯ ВЫНОСІЦЬ РАШЭННЕ
**5.2** ПАТРАБАВАННЕ БЕСПЕРАПЫННАГА ПРАЖЫВАННЯ – АБГРУНТАВАННЕ ПЕРАПЫНКАЎ У ПРАЖЫВАННІ
**5.3** ДАКУМЕНТЫ
**5.4** ДАДАТКОВЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ЗАЯВЫ
**5.5** ПАКІДАННЕ ЗАЯВЫ БЕЗ РАЗГЛЯДУ
**5.6** АДМОВА Ў ВЫДАЧЫ ДАЗВОЛУ НА ПАСЯЛЕННЕ
**5.7** АНУЛЯВАННЕ ДАЗВОЛУ НА ПАСЯЛЕННЕ
**5.8** ТЭРМІН НА ЯКІ ВЫДАЕЦЦА ДАЗВОЛ НА ПАСЯЛЕННЕ

**РАЗДЗЕЛ VI**
**ДАЗВОЛ НА ДОЎГАТЭРМІНОВАЕ ЗНАХОДЖАННЕ РЭЗУДЭНТА ЕС**
**6.1** УСТАНОВА, ЯКАЯ ВЫНОСІЦЬ РАШЭННЕ
**6.2** ДАКУМЕНТЫ
**6.3** ДАДАТКОВЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ЗАЯВЫ
**6.4** ПАКІДАННЕ ЗАЯВЫ БЕЗ РАЗГЛЯДУ

**6.5** АСОБЫ, ЯКІЯ НЕ МОГУЦЬ АТРЫМАЦЬ ДАЗВОЛ НА ДОЎГАТЭРМІНОВАЕ ЗНАХОДЖАННЕ РЭЗУДЭНТА ЕС
**6.6** ПАТРАБАВАННЕ 5-ГАДАВОГА ЛЕГАЛЬНАГА І БЕСПЕРАПЫННАГА ПРАЖЫВАННЯ
**6.7** ПАТРАБАВАННЕ БЕСПЕРАПЫННАГА ПРАЖЫВАННЯ – АБГРУНТАВАННЕ ПЕРАПЫНКАЎ У ПРАЖЫВАННІ
**6.8** АДМОВА Ў ВЫДАЧЫ ДАЗВОЛУ НА ДОЎГАТЭРМІНОВАЕ ЗНАХОДЖАННЕ РЭЗУДЭНТА ЕС
**6.9** АНУЛЯВАННЕ ДАЗВОЛУ НА ДОЎГАТЭРМІНОВАЕ ЗНАХОДЖАННЕ РЭЗУДЭНТА ЕС
**6.10** ПАЎТОРНАЕ АТРЫМАННЕ ДАЗВОЛУ НА ДОЎГАТЭРМІНОВАЕ ЗНАХОДЖАННЕ РЭЗУДЭНТА ЕС
**6.11** ТЭРМІН НА ЯКІ ВЫДАЕЦЦА ДАЗВОЛ НА ДОЎГАТЭРМІНОВАЕ ЗНАХОДЖАННЕ РЭЗУДЭНТА ЕС

**РАЗДЗЕЛ VII**
**ВІД НА ЖЫХАРСТВА**
**7.1** АГУЛЬНЫЯ ЗВЕСТКІ
**7.2** АБМЕН ВІДА НА ЖЫХАРСТВА
**7.3** УСТАНОВА ПА АБМЕНУ ВІДА НА ЖЫХАРСТВА
**7.4** СТРАТА ВІДА НА ЖЫХАРСТВА
**7.5** ПАДАРОЖНІЧАННЕ НА ПАДСТАВЕ ВІДА НА ЖЫХАРСТВА

**РАЗДЗЕЛ VIII**
**АПЕЛЯЦЫЙНАЯ ПРАЦЭДУРА**
**8.1** ПРОПУСК ТЭРМІНА
**8.2** АЗНАЯМЛЕННЕ З МАТЭРЫЯЛАМІ СПРАВЫ
**8.3** СПОСАБЫ ПАДАЧЫ ЗАЯВАЎ, ДАКУМЕНТАЎ, АБГРУНТАВАННЯЎ, ПАСВЕДЧАННЯЎ
**8.4** СКАРГА

## РАЗДЗЕЛ I

## ЯК ПРАВІЛЬНА ЗАПОЎНІЦЬ ЗАЯВУ

**Запаўняючы заяву аб выдачы дазволу на легальнае знаходжанне трэба памятаць каб:**

- **запоўніць заяву дакладна на польскай мове;**
- **запоўніць усе неабходныя графы заявы** ў адпаведнасці з фактычным станам;
- запоўніць вялікімі літарамі ў адпаведных кратках;
- калі раней вы падавалі **іншыя асабовыя даныя** – праінфармаваць аб гэтым у абгрунтаванні;
- **падаць месца фактычнага пражывання**, дзе атрымліваеце паштовыя адпраўлення;
- у графе адносна судзімасці **падаць інфармацыю аб усіх выдадзеных выраках і аб праходзячых судаводствах па крымінальных справах альбо адміністратыўных праванарушэннях**;
- у выпадку сумненняў адносна выдадзеных выракаў падаць, што судаводства ў ходзе развіцця (**УВАГА: аплата штрафу** не азначае, што крымінальнае судаводства не было разпачынена і не выдадзены вырак);
- далучыць да заявы **пацвярджэнне аплаты дзяржаўнага збору;**
- далучыць да заявы **фатаздымкі ў адпаведным фармаце;**
- паставіць уласнаручны **подпіс** і падаць **імя і прозвішча лацінскімі літарамі**;
- у выпадку хадайніцтва аб выдачы дазволу на часовае пражыванне з мэтаю далучэння да сям'і (арт. **53, ч. 1, п. 7,** Закона аб іншаземцах) заяву **падпісвае іншаземец пражываючы на тэрыторыі Рэспублікі Польшча,** аднак на дазвол для малалетняга дзіцяці патрэбна згода ўсіх асоб, якія маюць права бацькоўской апекі;
- прадставіць **дзейны падарожны** дакумент. У асаблівых выпадках, калі іншаземец **не валодае** дзейным падарожным дакументам і **не мае магчымасці атрымаць яго, можа прадставіць іншы дакумент пацвярджаючы яго асобу;**
- далучыць кожны дакумент, які можа пацвярдзіць даныя пададзеныя ў заяве альбо дапаможа хутка разглядзець справу;
- у выпадку сумненняў – **папрасіць дапамогі ў працаўніка ваяводскага праўлення.**

**РАЗДЗЕЛ II**

## АГУЛЬНЫЯ ЗВЕСТКІ

### 2.1 ЮРЫДЫЧНАЯ ПАДСТАВА

- Закон ад 13 чэрвеня 2003 г. аб іншаземцах (адзіны тэкст Дз. У. ад 2006 г. № 234 поз. 1694 са змяненнямі).
- Закон ад 14 чэрвеня 1960 г. – Кодэкс Працэсуальны ў органах выканаўчай улады (адзіны тэкст Дз. У. ад 2000 г. № 98, поз. 1071, са змяненнямі).
- Распараджэнне Еўрапейскага Парламента і Рады (WE) № 810/2009 ад 13 ліпеня 2009 г., якое устанаўлівае Візавы Кодэкс ЕС (Дз. Урз. УЕ Л 243 ад 15.09.2008, стр. 1).

### 2.2 УМОВЫ ЗНАХОДЖАННЯ ІНШАЗЕМЦАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ РП

**Іншаземец можа знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польша, калі валодае:**
1) дзейным падарожным дакументам;
2) дзейнаю візаю альбо іншым дзейным дакументам упаўнаважваючы да выязду і знаходжання на гэтай тэрыторыі, калі існуе патрабаванне;
3) дазвол на выязд да іншай дзяржавы альбо дазвол на пражыванне ў іншай дзяржаве, калі такі дазвол патрабуецца ў выпадку праезду транзытам.

Іншаземец можа падарожнічаць і знаходзіцца на тэрыторыі дзяржаў Шэнгенскай прасторы (таксама на тэрыторыі Рэспублікі Польшча) без неабходнасці набываць візу на працягу 3 месяцаў на працягу тэрміну 6 месяцаў на падставе нацыянальнай візы альбо дазволу на пражыванне выдадзенага праз адну з дзяржаў Шэнгенскай прасторы, **у выпадку Польшчы – від на жыхарства.** Адначасова іншаземец абавязаны выконваць агульныя ўмовы ўезду і знаходжання на тэрыторыі дзяржаў Шэнгенскай прасторы, гэта значыць:

- валодаць дзейным падарожным дакументам,
- патрапі абгрунтаваць мэту і ўмовы планаванага знаходжання, а таксама
- валодаць дастатковымі сродкамі на пражыванне альбо магчымасцю іх атрымання ў адпаведнасці з законам, а таксама
- не з’яўляецца асобаю, знаходжанне якой прадстаўляе небяспеку для грамадзянскага ладу, унутранай бяспекі, публічнага здароў’я альбо міжнародных адносін адной з дзяржаў ЕС, асабліва калі яго даныя не былі ўнесены на гэтай падставе да нацыянальных баз даных дзяржаў ЕС з мэтаю адмовы ўезду.

**Дзяржавы Шэнгенскай прасторы:** Аўстрыя, Бельгія, Данія, Фінляндыя, Францыя, Грэцыя, Іспанія, Люксембург, Нідэрланды, Германія, Партугалія, Швецыя, Італія, Эстонія, Літва, Латвія, Мальта, Польшча, Чэхія, Славакія, Славенія, Венгрыя, а таксама Швейцарыя, Нарвегія і Ісландыя (апошнія 3 дзяржавы не належаць да ЕС, але належаць да Шэнгенскай прасторы).

**Трэба падкрэсліць, што: Вялікабрытанія, Ірландыя, Кіпр, Балгарыя і Румынія з’яўляюцца дзаржавамі-членамі ЕС, але не належаць да дзаржаў Шэнгенскай прасторы.**

### 2.3 ПАТРАБАВАННІ ДА ЗАЯВАЎ, ДАКУМЕНТАЎ, АБГРУНТАВАННЯЎ, ПАСВЕДЧАННЯЎ

Заявы, хадайніцтва і дакументы па справах легалізацыі знаходжання іншаземцаў на тэрыторыі Рэспублікі Польшча павінны быць:

- **складзеныя на польскай мове;**
- **арыгіналамі альбо копіямі, пацверджанымі ў праўленні – верна з арыгіналам;**
- замест арыгіналу дакумента бок можа падаць копію дакумента, калі яго верагоднасць з арыгіналам пасведчана праз натарыўса альбо праз удзельнічаючага ў справе ўпаўнаважанага бокам адваката, юрысконсульта, прадстаўніка патэнтнага альбо падатковага консульта – **не адносіцца да падарожных дакументаў асобы;**
- **перакладзеныя на польскую мову праз прысяжнага перакладчыка – у выпадку дакументаў складзеных на замежнай мове**, якія з’яўляюцца доказам у працэсе (не адносіцца да падарожных дакументаў).

### 2.4 ТЭРМІН РАЗГЛЯДУ СПРАВЫ

**У адпаведнасці з абавязваючымя юрыдычнымі палажэннямі разгляд:**

- **справы ў парадку высняючага працэсу** павінен наступіць не пазней, чым праз адзін месяц,

- **асабліва складанай справы** – не пазней, чым праз два месяцы ад даты распачацця працэсу,
- а **ў парадку апеляцыйнай працэдура** – на працягу месяца ад даты атрымання апеляцыі.

**Разгляд справы аб атрыманні дазволу на пасяленне альбо дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС –** павінен наступіць не пазней, чым праз **3 месяцы** ад даты распачацця працэсу,

- у парадку **апеляцыйнай працэдура** – павінен наступіць на працягу **2 месяцаў** ад даты атрымання апеляцыі.

Перад прыняццём рашэння аб выдачы дазволу на часовае пражыванне / дазволу на пасяленне / дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС **адпаведны ваявода абавязаны звярнуцца да каменданта Пагранічнай стражы, каменданта Ваяводскага Ўпраўлення Паліцыі, Кіраўніка Агенцтва Ўнутранай Бяспекі,** а ў выпадку патрэбы да іншых органаў, **з заяваю перадаць інфармацыю - чы ўезд і знаходжанне іншаземцы на тэрыторыі Рэспублікі Польшча прадстаўляе пагрозу для абароны і бяспекі дзяржавы альбо аховы бяспекі і грамадзянскага ладу.**

Маючы на ўвазе факт, што вп. органы маюць абавязак перадаць неабходную інфармацыю на працягу 30 дзён неабходна спадзявацца, што **працэдура ў справе будзе цягнуцца больш 30 дзён.**

**Аб кожным выпадку не разгледжання справы ў вышэйпамянутых тэрмінах, орган першай і другой інстанцыі абавязаны праінфармаваць бок, падаць прычыну спазнення і новы тэрмін разгляду справы.**

## 2.5 ПАЎНАМОЦТВА

**Бок можа прадстаўляць свае інтарэсы праз упаўнаважанага прадстаўніка, хіба што характар дзеянняў патрабуе асабістага ўдзелу. Упаўнаважаным прадстаўнікам можа быць фізічная асоба валодаючая поўнай дзеяздольнасцю.**

- паўнамоцтва павінна быць складзена **ў пісьмовай форме альбо прадстаўлена да пратаколу**;
- упаўнаважаны прадстаўнік далучае да матэрыялаў справы **арыгінал альбо пацверджанае ў праўленні пасведчанне паўнамоцтва;**
- разам з паўнамоцтвам да акт справы трэба далучыць **пацвярджэнне аплаты дзяржаўнага збору ў памеры 17 польскіх злотых;**
- **дадзенае паўнамоцтва павінна ўваўнаважваць да прадстаўлення інтарэсаў іншаземцы ў вызначаным працэсе як перад ваяводам, так і перад Кіраўнікам Праўлення да Спраў Іншаземцаў.**

## 2.6 УРУЧЭННЕ ПАШТОВЫХ АДПРАЎЛЕННЯЎ

Усе лісты (паведамлення, вызавы, рашэння, пастановы і тд.) уручаюцца праз **пошту** пад распіску аб уручэнні, альбо праз чыноўнікаў органаў першай альбо другой інстанцыі.
**Лісты ўручаюцца на паданы бокам адрас альбо ў кожнае месца, дзе ён знаходзіцца.** Лісты можна ўручыць на месца працы асобе ўпаўнаважанай працадаўцам атрымліваць паштовыя адпраўлення.

## ЗМЕНА АДРАСА

У ходзе працэсу бакі, а таксама іх прадстаўнікі і ўпаўнаважаныя асобы маюць **абавязак праінфармаваць орган адміністрацыі аб кожнай змене сваяго адраса і месца знаходжання.** У ходзе працэсу лісты заўсёды ўручаюцца на апошні адрас, які быў пададзены ў органе.

- **У выпадку недагляду вп. абавязку ўручэнне ліста на апошні адрас прызнаецца сапраўдным.**
- **АДСУТНАСЦЬ АДРАСАТА:** У выпадку адсутнасці адрасата ліст уручаецца пад распіску даросламу жыльцу, суседу альбо наглядчыку дому, калі гэтыя асобы прыймуць рашэнне перадаць ліст адрасату. Адрасат паведамляецца аб дастаўцы ліста суседу альбо наглядчыку дома з дапамогай паведамлення, якое размяшчаецца ў паштовай скрыні альбо, калі гэта немагчыма, у дзвярах кватэры.

## ЛІСТЫ ЎРУЧАЮЦЦА:

- **Боку.** На пададзены праз яго **адрас**, а калі інтарэсы боку прадстаўляе ўпаўнаважаны прадстаўнік – гэтаму прадстаўніку.
  - **Бок мае абавязак пацвярдзіць атрыманне ліста сваім подпісам** і падаць дату ўручэння. Калі асоба ўхіліцца ад пацвярджэння ўручэння, даручаючы мае абавязак пацвердзіць дату ўручэння і падаць асобу, каторая атрымала ліст і прычыну адсутнасці падпісу.
  - **Калі бок ухіліцца прыняць ліст** высланы праз пошту альбо ўручаны іншым спосабам, ліст будзе звернуты адпраўшчыку з паметкай аб абмове прыняцця і даце адмовы. У гэтым выпадку прызнаецца, што ліст быў уручаны ў дзень адмовы яго прыняцця адрасатам.

- **Упаўнаважанай асобе.** Калі інтарэсы боку прадстаўляе ўпаўнаважаны прадстаўнік ліст уручаецца гэтаму прадстаўніку. Калі ўстаноўлена **некалькі ўпаўнаважаных прадстаўнікоў**, бок назначае аднаго з ніх да спраў уручэнняў і паведамляе аб гэтым орган, які праводзіць справу. **Калі іншаземец не назначы ўпаўнаважанага прадстаўніка,** ліст уручаецца толькі аднаму з прадстаўнікоў.

**У ВЫПАДКУ АДСУТНАСЦІ МАГЧЫМАСЦІ ЎРУЧЭННЯ ЛІСТА ЎКАЗАНЫМ ВЫШЭЙ СПОСАБАМ:**

- У выпадку ўручэння ліста поштай, яна захоўвае ліст на працягу 14 дзён у сваім адзяленні,
- У выпадку ўручэння ліста супрацоўнікам праўлення гміны (горада) альбо ўпаўнаважанай асобай ці органам, ліст захоўваецца на працягу 14 дзён у праўленні адпаведнай гміны (горада).

Паведамленне аб выхадзе ліста з інфармацыяй яго прыняцця на працягу 7 дзён, пачынаючы ад дня выстаўлення паведамлення, размяшчаецца ў паштовай скрыні альбо, калі гэта немагчыма, у дзвярах кватэры адрасата, яго офіса альбо іншага памяшкання, дзе адрасат выконвае сваю прафесійную дзейнасць альбо ў відавочным месцы каля ўваходу да дому адрасата.

У выпадку не прыняцця ліста ў вп. тэрміне, паўторна выстаўляецца паведамленне аб магчамасці прыняцця ліста **не пазней за 14 дзён ад першага паведамлення.**

**Уручэнне ліста лічыць зробленым ў апошні дзень вп. тэрміна, а ліст неабходна пакінуць у матэрыялах справы.**

## 2.7 УРУЧЭННЕ ПАСЫЛАК У ВЫПАДКУ ВЫЯЗДУ ЗА МЯЖУ

- У выпадку **выезду за мяжу** неабходна вызначыць **упаўнаважанага прадстаўніка да прадстаўлення інтарэсаў у Польшчы і паведаміць аб гэтым орган**, які праводзіць разгляд справы. У выпадку недагляду вп. абавязку ўручэнне ліста на апошні адрас прызнаецца сапраўдным.
- **Бок які пражывае за мяжой** альбо мае галоўны офіс за мяжой, у выпадку калі не ўстаноўлен упаўнаважаны прадстаўнік пражываючы ў краіне, абавязаны вызначыць упаўнаважанага прадстаўніка да прадстаўлення інтарэсаў у Польшчы. У выпадку **не вызначэння упаўнаважанага прадстаўніка да прадстаўлення інтарэсаў у Польшчы** прызначаныя для гэтага боку лісты перадаюцца да матэрыялаў справы з паметкай уручана

## 2.8 ПАТРАБАВАННЕ ПРЫТРЫМЛІВАЦЦА ТЭРМІНА

**Заявы і хадайніцтва складзеныя на польскай мове падаюцца ў вызначаным для гэтай дзеяння тэрміне. Тэрмін да выканання вызначанай дзеяння лічыцца прытрыманым, калі да яго заканчэння ліст быў:**

- высланы ў форме электроннага дакумента ў разуменні пастанаўленняў Закона ад 17 лютага 2005 г. аб камп’ютэрызацыі дзеяння суб’ектаў рэалізоўваючых дзяржаўныя праграмы, з пацверджаннем яго прадстаўлення да органа дзяржаўнага кіравання,
- высланы ў **польскім паштовым аддзяленні**,
- прадстаўлены да **польскай консульскай установы**,
- прадстаўлены салдатам да каманднай вайсковай часткі,
- прадстаўлены да капітана карабеля праз члена флоцкага экіпажа,
- прадстаўлены да адміністрацыі папраўчай установы праз асобу, пазбаўленую свабоды.

**Лісты таксама могуць быць прадстаўлены непасрэдна да ўстановы, якая праводзіць разгляд справы.**

**Акрамя таго, датаю вызначанай дзеяння лічыцца:**

- у выпадку ўручэння праз прадстаўніка **заграні́чнага паштовага аддзялення** – дата атрымання праз польскае паштовае аддзяленне (дата паштовага штампу польскага паштовага аддзялення);
- у выпадку ўручэння праз прадстаўніка **кур’ерскай фірмы** (пасылка высланая як у Польшчы, так і за мяжой) – дата атрымання праз вызначаную ўстанову.

**У выпадку пропуска тэрміна да дапаўнення фармальных недахопаў іншаземец на працягу сямі дзён** ад даты спынення прычыны пропуска тэрміна можа падаць заяву аб яго аднаўленні. **Іншаземец абавязаны абгрунтаваць, што пропуск тэрміна наступіў без яго віны. Адначасова з падачай заявы трэба дапоўніць фармальныя недахопы.**

## 2.9 АЗНАЯМЛЕННЕ З МАТЭРЫЯЛАМІ СПРАВЫ

- **На кожнай стадыі працэсу бок мае права на доступ да матэрыялаў справы, рабіць паметкі, копіі альбо выпіскі. Гэта права дзейнічае таксама пасля заканчэння працэдуры.**
- Бок можа звярнуцца з заяваю пасведчання выпісак і копій матэрыялаў справы альбо выдачы пасведчаных выпісак з матэрыялаў справы, калі гэта **абаснавана сур'ёзным інтарэсам для бока**.
- **Дзяржаўны збор пасведчання адпаведнасці выпіскі альбо копіі дакумента з актаў справы састаўляе 5 польскіх злотых** за кожную поўную альбо распачатую старонку.
- **Актыўны ўдзел у працэдуры.** Установы дзяржаўнай адміністрацыі абавязаны забязпечыць бакам актыўны ўдзел у кожнай стадыі працэдуры, а перад выдачаю рашэння прадставіць магчымасць пракаменціраваць сабраныя доказы і матэрыялы, а таксама прадстаўленыя запыты.
- Бок можа азнаёміцца з **сабранымі доказамі ў справе**, дапоўніць прадстаўленую заяву і зрабіць пасведчанне да пратаколу.

## 2.10 ДЗЯРЖАЎНЫ ЗБОР

**Абавязак па аплаце дзяржаўнага збору за адпаведныя формы легалізацыі пражывання ўзнікае пры паданні заявы да ваяводы.** Дзяржаўны сбор уносіцца на разліковы рахунак адпаведнай падатковай установы, якою з'яўляецца **войт (бургамістр, мэр горада)**. Асоба, якая падае заяву альбо іншае хадайніцтва, абавязана далучыць пацвярджэнне аплаты дзяржаўнага збору.

**Дзяржаўны збор неабходна плаціць за:**

- дазвол на часовае пражыванне – 340 польскіх злотых
- дазвол на пасяленне – 640 польскіх злотых
- дазвол на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС – 640 польскіх злотых
- прадаўжэнне нацыянальнай візы – 406 польскіх злотых
- факультатыўнае прадаўжэнне шэнгенскай візы – 30 еўра
- іншае рашэнне, акрамя вп., якое выдаецца на падставе Кодэкса Працэсуальнага ў органах выканаўчый улады – 10 польскіх злотых
- выдачу пасведчання - 17 польскіх злотых
- падачу дакумента, пацвярджаючага ўстанаўленне ўпаўнаважанага прадстаўніка альбо яго пасведчання, выпіскі, копіі - 17 польскіх злотых

**Калі заява на дазвол на часовае пражыванне / пасяленне ўключае дзяцей альбо іншыя асобы, каторыя знаходзяцца пад апекай іншаземца, вп. аплату неабходна ўносіць па кожнай з гэтых асоб.**
**Калі адзін з бакоў не заплаціць неабходную суму разам з падачай заявы, установа, якая праводзіць разгляд справы, назначыць тэрмін да аплаты. Гэты тэрмін не можа быць меньшы чым 7 дзён і даўжэйшы чым 14 дзён. Калі на працягу вызначанага тэрміна заяўнік не заплаціць неабходную суму заява падлягае звароту.** Падрабязны спіс прадметаў дзяржаўнага збору, стаўкі альбо ільготы знаходзяцца ў **дадатку да Закона ад 16 лістапада 2006г. аб дзяржаўным зборы (Дз. У. № 225 поз. 1635 са змяненнямі)**

## ЗВАРОТ ДЗЯРЖАЎНАГА ЗБОРУ

**Зварот дзяржаўнага збору надыходзіць па заяве бакоў у сітуацыі, калі нягледзячы на аплату дзяржаўнага збору не разпачата разгляду справы, не выдадзена пасведчанне альбо дазвол**. Дзяржаўны збор не звяртаецца пасля **пяці гадоў** з канца года, у каторым збор быў заплачаны. Адпаведна да арт. 12 ч. 1 вп. Закона аб дзяржаўным зборы, падатковай установай у пытаннях па джяржаўным зборы з'яўляецца **войт (бургамістр, мэр горада)**.

**РАЗДЗЕЛ III**

# ПРАДАЎЖЭННЕ ВІЗЫ

## 3.1 УСТАНОВА ЯКАЯ РАЗГЛЯДВАЕ ЗАЯВУ

Заява па **прадаўжэнню шэнгенскай альбо нацыянальнай візы** падаецца да **ваяводы па месцу жыхарства іншаземца.**

## 3.2 ПРАДАЎЖЭННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ВІЗЫ

Іншаземец, які знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча **можа прадоўжыць** тэрмін дзеяння выдадзенай **нацыянальнай візы** альбо тэрмін знаходжання дазволены на падставе гэтай візы, калі **ўсе** наступныя ўмовы будуць выкананы:

1) на іх карысць сведчыць **важны прафесійны інтарэс або асабісты інтарэс іншаземца ці гуманістычныя матывы**, якія робяць немагчымым пакінуць гэту тэрыторыю перад канцом тэрміна дзеяння нацыянальнай візы альбо да заканчэння дазволенага на падставе візы перыяду знаходжання;

2) здарэнні, якія з’яўляюцца прычынаю хадайніцтва аб прадаўжэнні нацыянальнай візы, узніклі **незалежна ад волі іншаземца** і не было магчымасці прадбачыць іх на дзень падачы заявы на выдачу візы.
3) абставіны справы не паказваюць, што **мэта знаходжання** іншаземца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча будзе **іншая, чым заяўлена**;
4) **не вынікаюць абставіны, якія выклікаюць адмову ў выдачы нацыянальнай візы**.

**Знаходжанне ў шпіталі**
Іншаземец які знаходзіцца ў шпіталі, стан здароў’я каторага выключае магчымасць пакінуць тэрыторыю Рэспублікі Польшча, тэрмін дзеяння выдадзенай яму нацыянальнай візы прадаўжаецца альбо тэрмін знаходжання дазволены на падставе гэтай візы прадаўжаецца да дня, калі стан яго здароў’я дазваляе пакінуць гэту тэрыторыю.

### ТЭРМІН ЗНАХОДЖАННЯ

Нацыянальную візу **можна прадоўжыць аднакроць. Тэрмін знаходжання** на тэрыторыі Рэспублікі Польшча на падставе прадоўжанай нацыянальнай візы **не можа быць даўжэйшы** ад тэрміна знаходжання прадбачанага для нацыянальнай візы, гз. **1 год.**

**УВАГА: Перыяд дзеяння візы не заўсёды адпавядае тэрміну знаходжання, на які ўпаўнаважвае віза.**

## 3.3 ПРАДАЎЖЭННЕ ШЭНГЕНСКАЙ ВІЗЫ

Іншаземец, які знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча **можа** прадоўжыць перыяд дзеяння выдадзенай візы альбо тэрмін знаходжання дазволены на падставе гэтай візы, калі:

- пасведчыць, што **ў сувязі з форс-мажорнымі абставінамі або гуманістычнымі матывамі** немагчыма пакінуць тэрыторыю дзяржаў-членаў перад канцом тэрміна дзеяння візы альбо да заканчэння дазволенага на падставе візы тэрміну знаходжання
    - **Вп. прадаўжэнне візы з’яўляецца дармовым.**
- прадставіць доказ існавання **важных асабістых прычын,** якія абгрунтоўваюць прадаўжэнне тэрміну дзеяння альбо тэрміну знаходжання.
    - **За вп. прадаўжэнне збіраецца аплата ў памеры 30 ЕЎРА.**

### ТЭРМІН ЗНАХОДЖАННЯ

**Тэрмін знаходжання** на тэрыторыі Рэспублікі Польшча на падставе прадоўжанай візы **не можа быць даўжэйшы** ад максімальнага тэрміна знаходжання прадбачанага для дадзенага віду візы, гз. **1 месяца** ў выпадку Шэнгенскай візы.

**УВАГА: Перыяд дзеяння візы не заўсёды адпавядае тэрміну знаходжання, на які ўпаўнаважвае віза**

## 3.4 ТЭРМІН ПАДАЧЫ ЗАЯВЫ

Іншаземец, які мае намер **прадоўжыць пражыванне на падставе:**

- **Шэнгенскай візы**
- **нацыянальнай візы**

абавязаны падаць да адпаведнага ваяводы па месцу сваяго жыхарства заяву аб прадаўжэнні візы **мінімум 3 дні перад заканчэннем тэрміна знаходжання, прадстаўленага ў візе, якую ён ужо мае.**

У выпадках, калі іншаземец пасведчыў, што **ў сувязі з форс-мажорнымі абставінамі або гуманістычнымі матывамі** немагчыма пакінуць тэрыторыю дзяржаў-членаў перад канцом тэрміна дзейяння візы альбо да заканчэння дазволенага на падставе візы тэрміну знаходжання, альбо калі іншаземец знаходзіцца **ў шпіталі**, заяву можна падаць **у апошнім дню тэрміну знаходжання прадстаўленага ў нацыянальнай альбо Шэнгенскай візе, якую ён ужо мае.**
Заява пададзеная пасля тэрміна застаецца **без разгляду.**

Іншаземецу, які падаў заяву аб прадаўжэнні візы ў вп. тэрміне ваявода ставіць у падарожным дакуменце іншаземца **штамп**, пацвярджаючы падачу заявы. Калі тэрмін падачы заявы быў прытрыманы і не існуе фармальных недахопаў альбо фармальныя недахопы былі дапоўнены ў адпаведным тэрміне, **знаходжанне іншаземца на тэрыторыі Польшчы лічыцца легальным** ад даты падачы заявы да даты, калі рашэнне аб прадаўжэнні нацыянальнай альбо Шэнгенскай візы стане канчатковым.

Калі **працэс** па справе прадаўжэння нацыянальнай альбо Шэнгенскай візы будзе **прыпынены на заяву іншаземца**, яго **пражыванне** ў гэтым часе **лічыцца нелегальным**

**УВАГА:**
**Штамп у падарожным дакуменце не дае права іншаземцу да паездак па тэрыторыі іншых дзяржаў Шэнгенскага пагаднення, але іншаземец можа паехаць да краю паходжання.**

## 3.5 РАШЭННЕ

Разгляд ў справе прадаўжэння нацыянальнай альбо Шэнгенскай візы наступае ў ходзе выдачы рашэння. Прадоўжанная нацыянальная альбо Шэнгенская віза выдаецца ў форме наклейкі да падарожнага дакумента.

## 3.6 ДАКУМЕНТЫ

Іншаземец, які **хадайнічае аб прадаўжэнні нацыянальнай альбо Шэнгенскай візы** абавязаны: прадставіць дзейны **падарожны дакумент,** абгрунтаваць **заяву** і далучыць да заявы:

1. **актуальны фатаздымак** – непашкоджаны, каляровы, з памерамі 35x45 мм, зроблены на працягу апошніх 6 месяцаў на ясным фоне, з добраю вастрынёю, на якім выразна віднеюць вочы і твар ад верхняй часткі галавы да верхняй часткі плеч, каб твар займавала 70-80 % фатаздымку; на фатаздымку асоба павінна быць прадстаўлена без галаўнога ўбору і цёмных акуляраў, глядзець перад сабой з адкрытымі вачыма, не закрытымі валасамі, з натуральным выразам твары і закрытым ротам,
2. **дакументы, якія пацвярджаюць:**
   - **мэту знаходжання** і неабходнасць прадаўжэння нацыянальнай альбо Шэнгенскай візы,
   - **медыцынскае страхаванне** ў адпаведнасці з палажэннямі аб забяспячэнні медычнай апекі фінансаванай за кошт дзяржаўных сродкаў альбо падарожнаго медычнага страхавання на мінімальную суму страхавання ў памеры 30.000 эўро, дзейнае праз перыяд запланаванага знаходжання іншаземца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча, каб пакрыць ўсе выдаткі, якія могуць узнікнуць на працягу знаходжання на гэтай тэрыторый у сувязі з неабходнасцю павяртанння па медыцынскіх прычынах, патрэбаю неадкладнай медыцынскай дапамогі, неадкладнага лячэння ў шпіталі альбо ў выпадку смерці, у якім страхоўшчык абавязваецца пакрыць выдаткі за медыцынскія паслугі аказаныя застрахаванай асобе непасрэдна да ўстановы, якая аказала такія паслугі, на падставе выстаўленага рахунка да аплаты – у выпадку прадаўжэння нацыянальнай візы,
   - **падарожнаго медычнага страхавання** на мінімальную суму страхавання ў памеры 30.000 эўро - **у выпадку прадаўжэння Шэнгенскай візы**,
   - іншыя абставіны прадстаўленыя ў заяве.

## ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДАРОЖНАГА ДАКУМЕНТА:

**Іншаземец, які хадайнічае аб прадаўжэнні нацыянальнай альбо Шэнгенскай візы абавязаны прадставіць да азнаямлення падарожны дакумент спаўняючы наступныя ўмовы:**

1) **тэрмін дзеяння** падарожнага дакумента заканчваецца не раней чым за **3 месяца** да заканчэння тэрміна дзеяння заяўленай візы;
2) змяшчае не меньш чым **две чыстыя старонкі**;
3) быў **выдадзены на працягу апошніх 10 гадоў**.

**РАЗДЗЕЛ IV**

## ДАЗВОЛ НА ЧАСОВАЕ ПРАЖЫВАННЕ

Заявы на прызнанне дазволу на часовае пражыванне можна падаваць, калі існуюць абставіны да пражывання на тэрыторыі Рэспублікі Польша праз **тэрмін даўжэйшы чым 3 месяцы**.

## 4.1 АБСТАВІНЫ, ЯКІЯ МОГУЦЬ БЫЦЬ ПАДСТАВАЙ ДА ВЫДАЧЫ ДАЗВОЛУ НА ЧАСОВАЕ ПРАЖЫВАННЕ

### 1. ПРАЦА

у выпадку калі іншаземец мае **дазвол на працу альбо пасведчанне ад працадаўцы ў пісьмовай форме** аб намеры даручэння іншаземцу выканання працы, калі дазвол на працу не патрабуецца,

### 2. ПРАВЯДЗЕННЕ ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

на падставе палажэнняў абавязваючых у гэтай сферы на тэрыторыі Рэспублікі Польшча, карыснай для нацыянальнай эканомікі, і асабліва калі спрыяе ўзросту інвестыцыяў, перадачы тэхналогій, увядзенню спрыяльных інавацыяў альбо стварэнню новых месцаў працы,

### 3. УМАЦАВАНЫЯ ТВОРЧЫЯ ДАСЯГНЕННЯ

калі асоба з умацаванымі **творчымі дасягненнямі** мае намер прадаўжаць сваю творчасць на тэрыторыі Рэспублікі Польшча,

**4. ПРАФЕСІЙНАЕ НАВУЧАННЕ І ПРАЦОЎНЫЯ СТАЖЫ**

рэалізаваныя ў рамках праграмаў Еўрапейскага Супрацоўніцтва,

**5. З’ЯЎЛЯЕЦЦА ЧЛЕНАМ СЯМ’І**

у выпадку намеру сумеснага пражывання разам з працоўнікам мігрантам, у адпаведнасці з Еўрапейскай Сацыяльнай Картай, састаўленай ў Турыне 18 кастрычніка 1961 г. (Дз. У. ад 1999 г. № 8, поз. 67),

**6. ШЛЮБ З ГРАМАДЗЯНІНАМ ПОЛЬШЧЫ**

**7. ДАЛУЧЭННЯ ДА СЯМ’І**

калі іншаземец прыбывае на тэрыторыю Рэспулікі Польшча альбо знаходзіцца на гэтай тэраторыі з мэтаю далучэння да сям’і,

**8. МАЛАЛЕТНЯМУ ДЗІЦЯЦІ ІНШАЗЕМЦА, ЯКІ НАРАДЗІЎСЯ НА ТЭРЫТОРЫІ РП**

калі малалетні іншаземец знаходзіцца на тэрытрыі РП без апекі,

**9. МУЖУ / ЖОНЦЫ АЛЬБО ПАЎНАЛЕТНЯМУ ДЗІЦЯЦІ ІНШАЗЕМЦА**

калі іншаземец знаходзіўся на тэрыторыі Рэспублікі Польшча на працягу мінімум 5 гадоў на падставе дазволу на часовае пражыванне, прызнанае ў сувязі з абставінамі прадугледжанымі ў п. 7 (далучэнне да сям’і),

**10. АДАЎСТВО, РАЗВОД, СПЫНЕННЕ СЯМЕЙНЫХ АДНОСІН БЕЗ СКАСАВАННЯ ШЛЮБУ АЛЬБО СМЕРЦЬ ЧЛЕНА СЯМ’І ПА ЗЫХОДНАЙ АЛЬБО ЎЗЫХОДНАЙ ЛІНІІ ПЕРШАЙ СТУПЕНІ**

у выпадку калі іншаземец знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча на падставе дазволу на часовае пражыванне выдадзенага ў сувязі з абставінамі прадугледжанымі ў п. 7 (палучэнне з сям’ёю), **калі сведчыць аб гэтым асабліва важны інтарэс іншаземца,**

**11. АДАЎСТВО АЛЬБО РАЗВОД**

у выпадку калі іншаземец знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча на падставе дазволу на часовае пражыванне выдадзенага ў сувязі з абставінамі прадугледжанымі ў п. 6 (шлюб з грамадзянінам Польшчы), **калі сведчыць аб гэтым асабліва важны інтарэс іншаземца,**

**12. МАЛАЛЕТНЯМУ ДЗІЦЯЦІ ІНШАЗЕМЦА, ЯКІ НАРАДЗІЎСЯ НА ТЭРЫТОРЫІ РП**

калі малалетні іншаземец нарадзіўся на тэрыторыі Рэспублікі Польшча і з’яўляецца дзіцём іншаземца, які знаходзіцца на тэрыторыі РП на падставе дазволу на часовае пражыванне,

**13. ДАЗВОЛ НА ДОЎГАТЭРМІНОВАЕ ЗНАХОДЖАННЕ РЭЗУДЭНТА ЕС, ДАДЗЕНЫ ПРАЗ ІНШУЮ ДЗЯРЖАВУ-ЧЛЕНА ЕЎРАПЕЙСКАГА САЮЗА**

у выпадку калі іншаземец мае намер выконваць працу альбо праводзіць гаспадарчую дзейнасць на падставе палажэнняў абавязваючых у гэтай галіне на тэрыторыі Рэспублікі Польшча, распачаць альбо прадаўжаць навучанне альбо прафесійнае навучанне альбо прадставіць, што існуюць іншыя абставіны, якія абгрунтоўваюць яго пражыванне на тэрыторыі Рэспублікі Польшча,

**14. ЧЛЕНАМ СЯМ’І ІНШАЗЕМЦА, АБ ЯКІМ ГАВОРЫЦЦА Ў П. 13**

у выпадку калі іншаземец з’яўляецца членам сям’і іншаземца, які ўспамінаецца ў п. 13, з каторым знаходзіўся на тэрыторыі іншай дзяржавы-члена Еўрапейскага Саюза, суправаджаючым яго альбо жадае далучыць да яго,

**15. АХВЯРАМ ГАНДЛЮ ЛЮДЗЬМІ**

у выпадку калі іншаземец з’яўляецца ахвяраю гандлю людзьмі ў разуменні рамачнага рашэння Рады ад 19 ліпеня 2002 г. аб барацьбе з гандлем людзьмі і выконвае ўсе наступныя ўмовы:

1. знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча,
2. распачаў супрацоўніцтва з установаю, якая праводзіць разбірацельства ў галіне барацьбы з гандлем людзьмі,
3. не кантактуецца з асобамі падазраванымі ў здзяйсненні забароненых злачынстваў звязаных з гандлем людзьмі,

### 16. НАВУЧАННЕ Ў ВЫШЭЙШАЙ НАВУЧАЛЬНАЙ УСТАНОВЕ НА СТАЦЫЯНАРНАЙ ФОРМЕ НАВУЧАННЯ АЛЬБО СТАЦЫЯНАРНАЕ НАВУЧАННЕ Ў ДАКТАРАНТУРЫ

у выпадку калі іншаземец прыязджае альбо знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча з мэтаю навучання ў вышэйшай установе на стацыянарнай форме навучання альбо на стацыянарнай форме навучання ў дактарантуры на гэтай тэрыторыі, альбо калі распачаў навучанне на тэрыторыі іншай дзяржавы-члена Еўрапейскага Саюза з намерам прадаўжэння навучання альбо завяршэння на тэрыторыі Рэспублікі Польшча,

### 17. ВЫКОНВАННЕ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДВАННЯЎ

калі іншаземец з'яўляецца навукоўцам, які прыязджае альбо знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча з мэтаю выконвання навуковых даследванняў на падставе дагавора аб прыняцці навукова-даследчага праекта, заключанага з адпаведнаю навуковаю ўстановаю і зацверджанага міністрам па справах навукі.

### 18. ВАЛОДАННЕ ДАКУМЕНТАМ НА ЖЫХАРСТВА З ПАМЕТКАЮ «НАВУКОВЕЦ»

калі іншаземец **валодае дакументам на жыхарства**, які ўпамінаецца ў арт. 1 ч. 2 літ. «а» распараджэння Рады (ЕС) № 1030/2002 ад 13 чэрвеня 2002 г. устанаўліваючым адзіны фармат дакументаў на жыхарства для грамадзян трэціх джяржаў (Дз. Урз. ЕС Л 157 ад 15.06.2002, стр. 1-7) **з паметкаю «навуковец»,** выдадзеным праз іншую дзяржаву-члена Еўрапейскага Саюза, калі дагавор аб прыняцці навукова-даследчага праекта, заключанага з адпаведнаю навуковаю ўстановаю гэтай дзяржавы і прадугледжвае правядзенне даследванняў на тэрыторыі Рэспублікі Польшча,

### 19. ГРАМАДЗЯНЕ РЭСПУБЛІКІ ТУРЦЫЯ

**у выпадку, калі грамадзянін Рэспублікі Турцыя валодае паўнамоцтвамі да выконвання працы на тэрыторыі Рэспублікі Польшча** ў адпаведнасці з палажэннямі прадстаўленымі ў прававых актах, выдадзеных праз установы ўтворанныя ў рамках Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Еўрапейскім Эканамічным Супольніцтвам і **Турцыяй**, падпісанага ў г. Анкара 12 верасня 1963 г. (Дз. Урз. ЕС L 217 ад 29.12.1964, стр. 3687).

Акрамя гэтага абставінамі, на падставе каторых **можна прызнаць іншаземцу** дазвол на часовае пражыванне, з'яўляюцца:

### 20. НАВУЧАННЕ

### 21. ПРАФЕСІЙНАЕ НАВУЧАННЕ

### 22. СЯМЕЙНЫЯ СУВЯЗІ

у выпадку калі іншаземец мае намер далучыць да польскага грамадзяніна альбо грамадзяніна дзяржавы-члена Еўрапейскага Супрацоўніцтва, дзяржавы-члена Еўрапейскага Пагаднення аб Свабодным Гандлі (EFTA) – бакі дагавора аб Еўрапейскай Эканамічнай Зоне альбо Швейцарскай Канфедырацыі, які пражывае на тэрыторыі Рэспублікі Польшча альбо мае намер пражываць з нім;

### 23. СЬВЯТАР, ЧЛЕН ОРДЭНА АЛЬБО АСОБА, ЯКАЯ ВЫКОНВАЕ РЭЛІГІЙНЫЯ ФУНКЦЫІ Ў КАСЦЁЛАХ І РЭЛІГІЙНЫХ АБ'ЯДНАННЯХ

у выпадку іншаземца, які з'яўляецца сьвятарам, членам ордэна альбо асобаю, якая выконвае рэлігійныя фунцыі ў касцёлах і рэлігійных аб'яднаннях, статус якіх рэгулюецца міжнароднымі пагадненнямі, палажэннямі законаў аб стаўленні дзяржавы адносна касцёла альбо іншага рэлігійнага аб'яднання альбо якія дзейнічаюць на падставе рэгістрацыі ў рэестры касцёлаў і іншых рэлігійных аб'яднанняў, а яго знаходжанне на тэрыторыі Рэспублікі Польшча звязана з выконваннем функцыі альбо падрыхтоўкай да яе выконвання;

### 24. ІНШЫЯ АБСТАВІНЫ

у выпадку калі іншаземец прадставіць, што існуюць іншыя абставіны, якія абгрунтоўваюць яго знаходжанне на тэрыторыі Рэспублікі Польшча.

## 4.2 ДАЗВОЛ НА ЧАСОВАЕ ПРАЖЫВАННЕ Ў ВЫПАДКУ НЕЛЕГАЛЬНАГА ЗНАХОДЖАННЯ НА ТЭРЫТОРЫІ РП

**Дазвол на часовае пражыванне можа быць выдадзены іншаземцу, які знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча нелегальна, калі:**

1. польскае заканадаўства патрабуе **асабістай прысутнасці іншаземца ў польскай дзяржаўнай установе**;
2. **асаблівая асабістая сытуацыя** патрабуе прысутнасці іншаземца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча;
3. патрабуе гэтага **інтарэс Рэспублікі Польшча**;
4. установа, упаўнаважаная праводзіць разбірацельства ў галіне барацьбы з гандлем людзьмі сцвярджае, што **іншаземец верагодна з'яўляецца ахвяраю гандлю людзьмі** ў разуменні рамачнага рашэння Рады ад 19 ліпеня 2002 г. аб барацьбе з гандлем людзьмі (Дз. Урз. ЕС Л 203 ад 01.08.2002, стр. 1; Дз. Урз. ЕС польскае спецыяльнае выданне, раздз. 19, т. 6, стр. 52).

## 4.3 ДАДАТКОВЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ЗАЯВЫ

Іншаземец абавязаны падаць заяву аб прызнанні дазволу на часовае пражыванне да адпаведнага ваяводы па месцу жыхарства **па меньшай меры за 45 дзён да заканчэння тэрміну знаходжання** прадстаўленага ў візе альбо да заканчэння тэрміна дзеяння папярэдняга дазволу на часовае пражыванне. **Тэрмін 45 дзён не аднаўляецца.**

Калі тэрмін падачы заявы быў прытрыманы і не існуе фармальных недахопаў альбо фармальныя недахопы былі дапоўнены ў вызначаным тэрміне, ваявода ставіць у падарожным дакуменце іншаземца **штамп**, пацвярджаючы падачу заявы. **Знаходжанне іншаземца на тэрыторыі Польшчы лічыцца легальным да даты выдачы канчатковага рашэння па справе.**

Калі **працэс** па справе прызнання дазволу на часовае пражыванне будзе **прыпынены на заяву іншаземца**, яго **пражыванне** ў гэтым часе **лічыцца нелегальным.**

**УВАГА:**
**Штамп у падарожным дакуменце не дае права іншаземцу да паездак па тэрыторыі іншых дзяржаў Шэнгенскага пагаднення, але іншаземец можа паехаць да краю паходжання.**

У выпадку **калі заява была пададзена меньш чым за 45 дзён** да заканчэння тэрміну знаходжання прадстаўленага ў візе альбо да заканчэння тэрміна дзеяння папярэдняга дазволу на часовае пражыванне, а разбірацельства не завершана перад заканчэннем тэрміна дзеяння дазволу на пражыванне, **іншаземец абавязаны пакінуць тэрыторыю Рэспублікі Польшча** да заканчэння тэрміну знаходжання прадстаўленага ў візе альбо на падставе дазволу на часовае пражыванне. У выпадку адмовы пакінуць тэрыторыю Рэспублікі Польшча і знаходжання на тэрыторыі Польшчы нелегальна, ваявода абавязаны выдаць рашэнне аб адмове выдачы дазволу на часовае пражыванне.

Іншаземец абавязаны **пакінуць тэрыторыю Рэспублікі Польшча** да заканчэння тэрміну дзеяння дазволу на часовае пражыванне, хіба што атрымаў наступны дазвол на часовае пражыванне, дазвол на пасяленне альбо дазвол на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС на тэрыторыі Рэспублікі Польшча.

Знаходжанне на тэрыторыі Рэспублікі Польшча без неабходнай візы, дазволу на часовае пражыванне, дазволу на пасяленне альбо дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС, а таксама выконванне працы альбо правядзенне гаспадарчай дзейнасці ў неадпаведнасці з абавязваючым законам падвяргае іншаземца на выдачу рашэння наказваючага **пакінуць тэрыторыю Рэспублікі Польшча** альбо рашэння, наказваючага **выгнанне з тэрыторыі Рэспубліка Польшча** і адсутнасць паўторнай магчамасці прыбыцця на працягу перыяда да 5 гадоў. Даныя іншаземцы, які атрымаў рашэнне аб выгнанні з тэрыторыі Рэспублікі Польшчы перадаюцца да рэгістрацыі ў Шэнгенскую Інфармацыйную Сістэму (SIS) з мэтаю адмовы ўезду на тэрыторыю ўсіх дзяржаў Шэнгенскай прасторы на працягу вп. перыяду.

## 4.4 УСТАНОВА ЯКАЯ РАЗГЛЯДВАЕ ЗАЯВУ

Заява аб прызнанні дазволу на часовае пражыванне падаецца да **адпаведнага ваяводы па месцу жыхарства іншаземца**, а ў выпадку знаходжання іншаземцы за мяжою – **праз консула да адпаведнага ваяводы па месцу планаванага пражывання іншаземца.**

## 4.5 ДАКУМЕНТЫ

Іншаземец абавязаны:

- прадставіць **дзейны падарожны дакумент**. У асабліва абгрунтаваных абставінах, калі іншаземец не мае дзейнага падарожнага дакумента і не мае магчымасці атрымаць яго, можа прадставіць **іншы дакумент пацвярджаючы яго асобу.**
- Прадставіць **запоўнены фармуляр заявы** і далучыць да заявы:
  - **4 актуальныя фатаздымкі -** непашкоджаныя, каляровыя, з памерамі 35x45 мм, зробленыя на працягу апошні 6 месяцаў на ясным фоне, з добраю вастрынёю, і на якім выразна віднеюць вочы і

твар ад верхняй часткі галавы да верхняй часткі плеч, каб твар займавала 70-80 % фатаздымку; на фатаздымку асоба павінна быць прадстаўлена без галаўнога ўбору і цёмных акуляраў, глядзець перад сабой з адкрытымі вачыма, не закрытымі валасамі, з натуральным выразам твары і закрытым ротам;

- **дакументы неабходныя да пацвярджэння даных, якія замешчаны ў заяве** і абставіны, якія абгрунтоўваюць падачу заявы на выдачу дазволу на часовае пражыванне;
- **пасведчанне аплаты дзяржаўнага збору;**
- **дакументы, якія пацвярджаюць медыцынскае страхаванне** ў адпаведнасці з палажэннямі аб забяспячэнні медычнай апекі фінансаванай за кошт дзяржаўных сродкаў альбо пацвярджэнне страхаўшчыка пакрыць выдаткі на лячэнне на тэрыторыі Рэспублікі Польшча. Вп. дакументы неабходна далучаць у выпадку хадайніцтва аб прызнанні дазволу на часовае пражывання з-за:
  - выконвання працы (п. 1); правядзення гаспадарчай дзейнасці (п. 2); далучэння да сям'і (п. 7); дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС, дадзены праз іншую дзяржаву-члена Еўрапейскага Саюза (п. 13); навучання ў вышэйшай навучальнай установе на стацыянарнай форме навучання (п. 16); навучання (п. 20); прафесійнага навучання (п. 21); сямейных сувязей (п. 22); іншых абставін (п. 24) **а таксама**
  - у выпадку: мужа/жонкі альбо паўналетняга дзіцяці іншаземца, аб якім гаворыцца ў арт. 54 (п. 9); члена сям'і іншаземца, аб якім гаворыцца ў п. 13 (п. 14); навукоўцаў (п. 17); іншаземцаў, якія валодаюць дакументам на жыхарства з паметкаю «навуковец» (п. 18); сьвятарам, членам ордэна альбо асобам, якія выконваюць рэлігійныя фунцыі ў касцёлах і рэлігійных аб'яднаннях (п. 23).
- **дакументы, якія пацвярджаюць стабільныя і рэгулярныя даходы** дастатковыя да пакрыцця выдаткаў на ўтрыманне сябе і членаў сям'і, на ўтрыманні іншаземцы. Вп. дакументы неабходна далучаць у выпадку хадайніцтва аб прызнанні дазволу на часовае пражывання з-за:
  - выконвання працы (п. 1); правядзення гаспадарчай дзейнасці (п. 2); далучэння да сям'і (п. 7); дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС, дадзены праз іншую дзяржаву-члена Еўрапейскага Саюза (п. 13); прафесійнага навучання (п. 21); сямейных сувязей (п. 22); іншых абставін (п. 24) **а таксама**
  - у выпадку: мужа/жонкі альбо паўналетняга дзіцяці іншаземца, аб якім гаворыцца ў арт. 54 (п. 9); члена сям'і іншаземца, аб якім гаворыцца ў п. 13 (п. 14).
- **дакументы, якія пацвярджаюць валоданне дастатковымі фінансавымі сродкамі на пакрыццё выдаткаў на ўтрыманне і вяртанне да краю паходжання.** Вп. дакументы неабходна далучаць у выпадку хадайніцтва аб прызнанні дазволу на часовае пражывання з-за:
  - навучання ў вышэйшай навучальнай установе на стацыянарнай форме навучання (п. 16);
  - навучання (п. 20) **а таксама**
  - у выпадку: навукоўцаў (п. 17); іншаземцаў, якія валодаюць дакументам на жыхарства з паметкаю «навуковец» (п. 18).
- **права на жыллё**, дзе іншаземец знаходзіцца альбо мае намер знаходзіцца. **За права на жыллё**, дзе іншаземец знаходзіцца альбо мае намер знаходзіцца, **не лічыцца дагавор прадстаўлення ў распараджэнне жылля**, хіба што **асобаю якая прадстаўляе жыллё з'яляецца член сям'і па зыходняй альбо ўзыходняй лініі першай ступені, альбо мужам/жонкаю, бацькамі мужа/жонкі альбо братам/сястрою іншаземца.**

**Права на жыллё** неабходна далучаць у выпадку хадайніцтва аб прызнанні дазволу на часовае пражывання з-за:

- выконвання працы (п. 1); правядзення гаспадарчай дзейнасці (п. 2); далучэння да сям'і (п. 7); дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС, дадзены праз іншую дзяржаву-члена Еўрапейскага Саюза (п. 13); навучання (п. 20); прафесійнага навучання (п. 21); сямейных сувязей (п. 22); іншых абставін (п. 24) **а таксама**
- у выпадку: мужа/жонкі альбо паўналетняга дзіцяці іншаземца, аб якім гаворыцца ў арт. 54 (п. 9); члена сям'і іншаземца, аб якім гаворыцца ў п. 13 (п. 14)

**ВЫКЛЮЧЭННЕ**

**Вымаганне аб прадстаўленні дакументаў, пацвярджаючых валоданнем: правам на жыллё, стабільнымі і рэгулярнымі даходамі і медыцынскім страхаваннем не датычыць**: мужа/жонкі польскага грамадзяніна, непаўналетняга дзіцяці які нарадзіўся на тэрыторыі Рэспублікі Польшча і з'яўляецца дзіцём іншаземца, які знаходзіцца на тэрыторыі РП на падставе дазволу на часовае пражыванне, іншаземцаў, якія ўдзельнічаюць у прафесійным навучанні і працоўнах стажах рэалізаваныя ў рамках праграмаў Еўрапейскага Супрацоўніцтва і ахвяр гандлю людзьмі.

## 4.6 ЧЛЕН СЯМ'І

**Членам сям'і іншаземца** з'яўляецца:

1) асоба, якая заключыла з нім **шлюб** прызнаны сапраўдным праз заканадаўства Рэспублікі Польшча;
2) **малалетняе дзіцё** гэтага іншаземца і асобы, якая заключыла з нім **шлюб** прызнаны сапраўдным праз заканадаўства Рэспублікі Польшча, а таксама прыёмнае дзіцё;
3) **малалетняе дзіцё** гэтага іншаземца, а таксама прыёмнае дзіцё, якое пазастае на яго ўтрыманні і над якім іншаземец ажыццяўляе фактычную бацькоўскую ўладу;
4) **малалетняе дзіцё** асобы, аб якой гаворыцца ў п. 1, а таксама прыёмнае дзіцё, якое пазастае на яго ўтрыманні і над якім іншаземец ажыццяўляе фактычную бацькоўскую ўладу;
5) членам сям'і **малалетняга іншаземца, які валодае статусам бежанца** і знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча з'яўляецца таксама член сям'і па зыходняй лініі першай ступені.

Адпаведна да арт. 54 Закона аб іншаземцах **дазвол на часовае пражыванне з мэтаю далучэння да сям'і** прызнаецца члену сям'і іншаземца, які знаходзіцца на тэрытрыі Рэспублікі Польшча:

1. на падставе дазволу на пасяленне;
2. на падставе дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС;
3. які валодае статусам бежанца;
4. у сувязі з прадстаўленнем дадатковай ахновы;
5. мінімум на працягу 2 гадоў на падставе дазволу на часовае пражыванне, у тым ліку непасрэдна перад паданнем заявы аб прызнанні дазволу на часовае пражыванне для члена сям'і – на падставе дазволу выдадзенага на тэрмін пражывання не меньшы чым 1 год;
6. на падставе дазволу на часовае пражыванне, аб якім гаворыцца ў арт. 53 ч. 1 п. 17 і 18.

## 4.7 ТЭРМІН НА ЯКІ ВЫДАЕЦЦА ДАЗВОЛ НА ЧАСОВАЕ ПРАЖЫВАННЕ

**Дазвол на часовае пражыванне выдаецца ў кожным выпадку на тэрмін неабходны для рэалізацыі мэты знаходжання** іншаземца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча, але не даўжэйшы чым **2 гады.**
У выпадку, калі абставінамі хадайніцтва аб атрыманні дазволу на часовае пражыванне з'яўляюцца:

- **далучэнне да сям'і –** на такі тэрмін, на які выдадзены дазвол на часовае пражыванне іншаземцы, да якога мае намер далучыць, а калі іншаземец валодае дазволам на пасяленне, дазволам на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС альбо статусам бежанца выдадзеным у Рэспубліцы Польшча – на тэрмін 2 гадоў
- у выпадку іншаземцы, які з'яўляецца **ахвяраю гандлю людзьмі** – на тэрмін 6 месяцаў
- у выпадку іншаземцы, аб якім гаворыцца ў **арт. 53а ч. 2** - на тэрмін неабходны для рэалізацыі мэты, для якой выдадзена, альбо да часу прыняцця рашэння аб супрацоўніцтве з уласціваю ўстановаю, якая праводзіць разбірацельсьтва ў галіне барацьбы з гандлем людзьмі, **не даўжэйшы чым на 3 месяцы**
- у выпадку **малалетняга дзіцяці** - на тэрмін, на які выдадзены дазвол на часовае пражыванне яго праўнаму прадстаўніку
- **навучанне ў вышэйшай навучальнай установе** – 1 год
- **прафесійнае навучанне альбо навучанне** – на тэрмін навучання альбо прафесійнага навучання, але не даўжэй чым на 1 год
- правядзенне **навуковых даследванняў** – 1 год

**УВАГА:**
У выпадку, калі абставінамі хадайніцтва аб атрыманні дазволу на часовае пражыванне з'яўляюцца абставіны, аб якіх гаворыцца ў арт. 53 ч. 1 **п. 16-18** (п. 16 – навучанне ў вышэйшай навучальнай установе на стацыянарнай форме навучання альбо стацыянарнае навучанне ў дактарантуры; п. 17 – правядзенне навуковых даследванняў; п. 18 – валоданне дакументам на жыхарства з паметкаю «навуковец»), і якія абгрунтоўваюць знаходжанне іншаземца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча **праз тэрмін меньшы чым 1 год,** дазвол на часовае пражыванне выдаецца ў выпадку, аб якім гаворыцца ў арт. 53 ч. 1:

1) п. 16 – **на тэрмін навучання**;
2) п. 17 – **на тэрмін правядзення навуковага праекта**;
3) п. 18 – **на тэрмін правядзення навуковых даследванняў на тэрыторыі Рэспублікі Польшча**.

## 4.8 ПАКІДАННЕ ЗАЯВЫ БЕЗ РАЗГЛЯДУ

**Заява на выдачу дазволу на часовае пражыванне** застаецца без разгляду, калі іншаземец:

1. знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча на падставе Шэнгенскай візы ўпаўнаважваючай толькі да ўезду і знаходжання на тэрытрыі Рэспублікі Польшча з мэтаю, аб якой гаворыцца **ў арт. 26, ч. 1, п. 26** альбо дазволу на часовае пражыванне аб якім гаворыцца ў **арт. 53а, ч. 2 (раздзел 4.2),** акрамя выпадкаў хадайніцтва аб прызнанні дазволу на часовае пражыванне на падставе **арт. 53, ч. 1, п. 15 (раздзел 4.1, п. 15)**,

2. аб якім гаворыцца ў арт. 110, гз. **затрыманы, размешчаны ў ахоўным аб'екце**, у ізалятары часовага ўтрымання з мэтаю высылкі, у дачыненні да якога былі прыняты превентыўныя меры як - забарона пакідаць межы краю альбо пазбаўленне волі з прычыны выканання рашэнняў выдадзеных на падставе візы;
3. **валодае дазволама на талераванае пражыванне**

**а таксама**

4. **заява заключаючае фармальныя недахопы**, гэта значыць калі**:**

- незапоўнена ўсе неабходныя графы заявы;
- не прадстаўлена дзейны падарожны дакумент альбо ў асабліва абгрунтаваных выпадках калі іншаземец не валодае дзейным падарожным дакументам і не мае магчымасці яго атрымаць – іншы дакумент, пацвярджаючы асобу іншаземца;
- не далучана да заявы:
  - 4 актуальныя фатаздымкі;
  - права на жыллё ў неабходных выпадках;
  - дагавора аб правядзенні навуковых даследванняў з навучальнаю ўстановаю, якая знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча, а таксама пасведчання ў пісьмовай форме прадстаўніка гэтай навуковай установы аб абавязку несці выдаткі на пражыванне і высылку іншаземца, пакрытыя за кошт дзяржаўных сродкаў на працягу 6 месяцаў ад даты заканчэння тэрміна дзеяння дагавора, калі высылка іншаземца адбываецца на падставе абставінаў пададзеных у арт. 88, ч. 1, п. 1, у выпадку іншаземца аб якім гаворыцца ў арт. 53, ч. 1, п. 17;
  - дагавора аб правядзенні навуковых даследванняў з навучальнаю ўстановаю, якая знаходзіцца на тэрыторыі іншай чым Рэспублікі Польшча дзяржавы-члена Еўрапейскага Саюза, а таксама пасведчання ў пісьмовай форме прадстаўніка гэтай навуковай установы аб абавязку несці выдаткі на пражыванне і высылку іншаземца, пакрытыя за кошт дзяржаўных сродкаў на працягу 6 месяцаў ад даты заканчэння тэрміна дзеяння дагавора, калі высылка іншаземца адбываецца на падставе абставінаў пададзеных у арт. 88, ч. 1, п. 1, у выпадку іншаземца аб якім гаворыцца ў арт. 53, ч. 1, п. 18;
  - згода асобы, якая ажыццяўляе бацькоўскую ўладу над малалетнім іншаземцам, які хадайнічае аб прызнанні дазволу на часовае пражыванне.

## 4.9 АДМОВА Ў ВЫДАЧЫ ДАЗВОЛУ НА ЧАСОВАЕ ПРАЖЫВАННЕ

**Іншаземец атрымлівае адмову на выдачу дазволу на часовае пражывання, калі:**

1. не выконвае патрабаванняў, аб якіх гаворыцца ў **арт. 53-53b;**
2. яго **даныя знаходзяцца ў спіску** іншаземцаў, знаходжанне якіх на тэрыторыі Рэспублікі Польшча з'яўляецца непажаданым;
3. яго **даныя знаходзяцца ў Шэнгенскай Інфармацыйнай Сістэме** з мэтаю адмовы ўезду;
4. абставіны справы ўказваюць на тое, што **мэта ўезду альбо знаходжання** іншаземца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча з'яўляецца альбо будзе **іншая, чым заяўлена**;
5. падставаю да хадайніцтва аб выдачы дазволу з'яўляецца заключэнне шлюбу з грамадзянінам Польшчы альбо з іншаземцам, які знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча і аб якім гаворыцца ў арт. 54, а **шлюб быў заключаны з мэтаю абысці палажэння** аб выдачы дазволу на часовае пражыванне;
6. гэта неабходна па **меркаваннях абароны і нацыянальнай бяспекі** альбо абароны бяспекі і грамадзянскага ладу альбо інтарэсаў Рэспублікі Польшча;
7. у ходзе працэсу па выдачы дазволу на часовае пражыванне:
   а) **падаў заяву** альбо далучыў да яе дакументы з **няпраўдзівымі асабовымі данымі альбо няпраўдзівай інфармацыяй**,
   б) **сведчыў няпраўдзівую інфармацыю альбо затаіў праўду,** альбо падрабіў альбо перадзелаў дакумент з мэтаю выкарыстаць яго ў якасці сапраўднага, альбо выкарыстоўваў такі дакумент як сапраўдны;
8. пастаўлены яму **дыягназ хваробы альбо інфекцыі**, якая падлягае абавязкаваму лячэнню на падставе Закона ад 5 снежаня 2008 г. аб прадухіленні і процідзейнічанні інфекцыям і інфекцыйным захворванням сярод людзей (Дз. У. № 234, поз. 1570), альбо ёсць падазрэнне такога захворвання, а іншаземец не дае згоды на лячэнне;
9. не выканаў **падатковых абавязкаў у адносінах да Дзяржаўнай Казны**;
10. **не вярнуў выдаткаў звязаных з высылкай**, якія фінансаваліся з дзяржаўнага буджэту;
11. знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча **нелегальна;**
12. хадайнічае аб выдачы наступнага дазволу на часовае пражыванне на падставе арт. 53, ч. 1, п. 16, але **не залічыў навучальны год і не атрымаў умоўнага заліку на наступны год альбо семестр**.

## 4.10 АНУЛЯВАННЕ ДАЗВОЛУ НА ЧАСОВАЕ ПРАЖЫВАННЕ

**Ануляванне дазволу на часовае пражыванне іншаземца наступае калі:**

1. прычына, на падставе якой ён атрымаў дазвол, больш не існуе;
2. паявілася хаця б адна з наступных абставінаў:

- даныя іншаземцы знаходзяцца ў спіску іншаземцаў, знаходжанне каторых на тэрыторыі Рэспублікі Польшча з’яўляецца непажаданым;
- абставіны справы ўказваюць на тое, што мэта ўезду альбо знаходжання іншаземца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча з’яўляецца альбо будзе іншая чым заяўлена;
- падставаю да хадайніцтва аб выдачы дазволу з’яўляецца заключэнне шлюбу з грамадзянінам Польшчы альбо з іншаземцам, які знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча і аб якім гаворыцца ў арт. 54, а шлюб быў заключаны з мэтаю абысці палажэння аб выдачы дазволу на часовае пражыванне;
- гэта неабходна па меркаваннях абароны і нацыянальнай бяспекі альбо абароны бяспекі і грамадзянскага ладу альбо інтарэсаў Рэспублікі Польшча;
- у ходзе працэсу па выдачы дазволу на часовае пражыванне:
  - падаў заяву альбо далучыў да яе дакументы з няпраўдзівымі асабовымі данымі альбо няпраўдзівай інфармацыяй,
  - сведчыў няпраўдзівую інфармацыю альбо затаіў праўду альбо падрабіў альбо перадзелаў дакумент з мэтаю выкарыстаць яго ў якасці сапраўднага, альбо выкарыстоўваў такі дакумент як сапраўдны;
- пастаўлены яму дыягназ хваробы альбо інфекцыі, якая падлягае абавязкаваму лячэнню на падставе Закона ад 5 снежаня 2008 г. аб прадухіленні і процідзейнічанні інфекцыям і інфекцыйным захворванням сярод людзей (Дз. У. № 234, поз. 1570), альбо ёсць падазрэнне такога захворвання, а іншаземец не дае згоды на лячэнне;
- не выканаў падатковых абавязкаў у адносінах да Дзяржаўнай Казны;
- знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча нелегальна.

3. пакінуў на пастаянна тэрыторыю Рэспублікі Польшча.

## 4.11 ХАДАЙНІЦТВА АБ ВЫДАЧЫ ДАЗВОЛУ НА ЧАСОВАЕ ПРАЖЫВАННЕ Ў ВЫПАДКУ ЗНАХОДЖАННЯ ЗА МЯЖОЙ

**Іншаземец, які знаходзіцца за мяжой** падае заяву аб выдачы дазволу на часовае пражыванне праз **консула** да ваяводы, адпаведнага па месцу запланаванага жыхарства. Заява аб выдачы дазволу на часовае пражыванне падаецца на фармуляры.

Калі заява на дазвол на часовае пражыванне была пададзены за мяжой, рашэнне ваяводы можа быць дастаўлена **праз консула**.

Калі на момант выдачы рашэння аб прызнанні дазволу на часовае жыхарства іншаземец знаходзіцца за мяжой, каб уехаць на тэрыторыю Польшчы іншаземец абавязаны хадатайнічаць аб выдачы **Шэнгенскай візы з мэтаю рэалізацыі дазволу на часовае пражыванне**.

**Від на жыхарства** будзе выдыдены пасля ўезду на тэрыторыю Польшчы ваяводам, які выдаў дазвол на часовае пражыванне. Іншаземей абавязаны **асасбіста** атрымаць від на жыхарства, а ў выпадку з малалетнім меньш чым 13 гадоў – атрымлівае яго праўны прадстаўнік альбо апякун.

**РАЗДЗЕЛ V**

## ДАЗВОЛ НА ПАСЯЛЕННЕ

**Дазвол на пасяленне прызнаецца іншаземцу, які:**

1. **з’яўляецца малалетнім дзіцём іншаземца,** які нарадзіўся на тэрыторыі Рэсрублікі Польшча, а іншаземец знаходзіцца на падставе дазволу на пасяленнее;
2. **заключыў шлюб** з грамадзянінам Польшчы **мінімум 3 гаду** да падачы заявы і непасрэдна перад падачаю заявы знаходзіўся бесперапынна на тэрыторыі Рэспублікі Польшча на працягу мінімум **2 гадоў** на падставе дазволу на часовае пражыванне;
3. непасрэдна перад падачаю заявы знаходзіўся бесперапынна на тэрыторыі Рэспублікі Польшча на працягу мінімум **10 гадоў на падставе дазволу на талераванае пражыванне,** выдаденага на падставе арт. 97, ч. 1, п. 1а альбо 2 Закона ад 13 чэрвеня 2003 г. аб прадстаўленні іншаземцу абароны на тэрыторыі Рэспублікі Польшча альбо на працягу **5 гадоў у сувязі з атрыманнем статусу бежанца альбо дадатковай абароны**;
4. з’яўляецца дзіцём грамадзяніна Польшчы і знаходзіцца пад яго бацькоўскаю ўладаю.

## 5.1 УСТАНОВА, ЯКАЯ ВЫНОСІЦЬ РАШЭННЕ

Заява аб выдачы дазволу на пасяленне падаецца да **ваяводы** па месцу жыхарства іншаземца. Заява аб выдачы дазволу на пасяленне падаецца на фармуляры.

## 5.2 ПАТРАБАВАННЕ БЕСПЕРАПЫННАГА ПРАЖЫВАННЯ – АБГРУНТАВАННЕ ПЕРАПЫНКАЎ У ПРАЖЫВАННІ

Знаходжанне на тэрыторыі Рэспублікі Польшча лічыцца **бесперапыненым**, калі **не было перапынкаў у пражыванні даўжэйшых ад 6 месяцаў і ў агульнай складальнасці перапынкі не перавышаюць 10 месяцаў**, акрамя наступных выпадкаў:

- **прычынаю перапынкаў было выкананне прафесійных абавязкаў** альбо выконванне працы за межамі Рэспублікі Польшча, на падставе працоўнага дагавора з працадаўцам, галоўны офіс каторага знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча;
- **прычынаю перапынкаў было спадарожнічанне разам з мужам/жонкай**, які выконвае прафесійныя абавязкі альбо працу ў абставінах прадстаўленых у п. 1;
- **прычынаю перапынкаў было лячэнне іншаземца**.

## 5.3 ДАКУМЕНТЫ

Іншаземец абавязаны:

- прадставіць **дзейны падарожны дакумент**. У асабліва абгрунтаваных абставінах, калі іншаземец не валодае дзейным падарожным дакументам і не мае магчымасці атрымаць яго, можа прадставіць **іншы дакумент пацвярджаючы яго асобу.**
- Прадставіць **запоўнены фармуляр заявы** і далучыць да заявы:
  - **4 актуальныя фатаздымкі -** непашкоджаныя, каляровыя, з памерамі 35x45 мм, зробленыя на працягу апошніх 6 месяцаў на ясным фоне, з добраю вастрынёю, і на якім выразна віднеюць вочы і твар ад верхняй часткі галавы да верхняй часткі плеч, каб твар займавала 70-80 % фатаздымку; на фатаздымку асоба павінна быць прадстаўлена без галаўнога ўбору і цёмных акуляраў, глядзець перад сабой з адкрытымі вачыма, не закрытымі валасамі, з натуральным выразам твары і закрытым ротам;
  - дакументы, неабходныя да пацвярджэння даных, якія замешчаны ў заяве і абставіны, якія абгрунтоўваюць падачу заявы на выдачу дазволу на пасяленне;
  - **пасведчанне аплаты** дзяржаўнага збору**;**
  - **права на жыллё**, дзе іншаземец знаходзіцца альбо мае намер знаходзіцца ў выпадку хадайніцтва аб атрыманні дазволу на пасяленне на падставе арт. 64, ч. 1, п. 3. **За права на жыллё**, дзе іншаземец знаходзіцца альбо мае намер знаходзіцца, **не лічыцца дагавор прадстаўлення ў распараджэнне жылля**, хіба што асобаю якая прадстаўляе жыллё з'яляецца член сям'і па зыходняй альбо ўзыходняй лініі першай ступені, альбо муж/жонка, бацькі мужа/жонкі альбо брат/сястра іншаземца.

## 5.4 ДАДАТКОВЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ЗАЯВЫ

Іншаземец можа падаць заяву аб прызнанні дазволу на пасяленне на працягу **згоднага з правам пражывання** на тэрыторыі Рэспублікі Польшча.

Калі іншаземец падаў заяву на працягу згоднага з правам пражывання на тэрыторыі Рэспублікі Польшча і не існуе фармальных недахопаў альбо фармальныя недахопы былі дапоўнены ў вызначаным тэрміне, ваявода ставіць у падарожным дакуменце іншаземца **штамп**, пацвярджаючы падачу заявы аб выдачы дазволу на пасяленне. Адначасова на працягу выконвання вышэйпамянутых дзеянняў, знаходжанне іншаземца на тэрыторыі Польшчы лічыцца легальным да даты выдачы канчатковага рашэння па справе дазволу на пасяленне.

Калі **працэс** па справе прызнання дазволу на пасяленне будзе **прыпынены на заяву іншаземца**, яго **пражыванне** ў гэтым часе **лічыцца нелегальным**.

**УВАГА:**
**Штамп у падарожным дакуменце не дае права іншаземцу да паездак па тэрыторыі іншых дзяржаў Шэнгенскага пагаднення, але іншаземец можа паехаць да краю паходжання.**

## 5.5 ПАКІДАННЕ ЗАЯВЫ БЕЗ РАЗГЛЯДУ

**Заява па прызнанню дазволу на пасяленне** застаецца без разгляду, калі іншаземец:

- знаходзіцца **за мяжой**;
- знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча **нелегальна**;
- знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча на падставе Шэнгенскай візы ўпаўнаважваючай толькі да ўезду і знаходжання на тэрытрыі Рэспублікі Польшча з мэтаю, аб якой гаворыцца **ў арт. 26, ч. 1, п. 26** Закона аб іншаземцах, г.з. з мэтаю ўезду па гуманістычных матывах, у сувязі з інтарэсам дзяржавы альбо ў сувязі з міжнароднымі абазяцельствамі;

- знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча на падставе дазволу на часовае пражыванне аб якім гаворыцца ў **арт. 53а, ч. 2** Закона аб іншаземцах, у выпадку нелегальнага знаходжання на тэрыторыі РП альбо
- затрыманы**, размешчаны ў ахоўным аб’екце**, у ізалятары часовага ўтрымання з мэтаю высылкі, у дачыненні да якога былі прыняты превентыўныя меры як - забарона пакідаць межы краю альбо пазбаўленне волі з прычыны выканання рашэнняў выдадзеных на падставе візы;

а таксама

- **заява заключаючае фармальныя недахопы, гэта значыць калі:**
  - незапоўнена ўсе неабходныя графы заявы;
  - не прадстаўлена дзейны падарожны дакумент альбо ў асабліва абгрунтаваных выпадках калі іншаземец не валодае дзейным падарожным дакументам і не мае магчымасці яго атрымаць – іншы дакумент, пацвярджаючы асобу іншаземца;
  - не далучана да заявы:
    - 4 актуальныя фатаздымкі;
    - права на жыллё ў неабходных выпадках.

## 5.6 АДМОВА Ў ВЫДАЧЫ ДАЗВОЛУ НА ПАСЯЛЕННЕ

**Іншаземец атрымлівае адмову на выдачу дазволу на пасяленне, калі:**

1. **не выконвае патрабаванняў,** аб якіх гаворыцца ў **арт. 64, ч. 1;**
2. яго **даныя знаходзяцца ў спіску** іншаземцаў, знаходжанне каторых на тэрыторыі Рэспублікі Польшча з’яўляецца непажаданым;
3. яго **даныя знаходзяцца ў Шэнгенскай Інфармацыйнай Сістэме** з мэтаю адмовы ўезду;
4. гэта неабходна па **меркаваннях абароны і нацыянальнай бяспекі** альбо абароны бяспекі і грамадзянскага ладу альбо інтарэсаў Рэспублікі Польшча;
5. асноваю да хадайніцтва аб выдачы дазволу з’яўляецца заключэнне шлюбу з грамадзянінам Польшчы, а **шлюб быў заключаны з мэтаю абысці палажэння** аб выдачы дазволу на часовае пражыванне альбо дазволу на пасяленне;
6. у ходзе працэсу па выдачы дазволу на пасяленне:
   a) **падаў заяву** альбо далучыў да яе дакументы з **няпраўдзівымі асабовымі данымі альбо няпраўдзівай інфармацыяй**,
   b) **сведчыў няпраўдзівую інфармацыю альбо затаіў праўду** альбо, падрабіў ці перадзелаў дакумент з мэтаю выкарыстаць яго ў якасці сапраўднага, альбо выкарыстоўваў такі дакумент як сапраўдны;
7. **не выканаў падатковых абавязкаў у адносінах да Дзяржаўнай Казны**;
8. **не вярнуў выдаткаў звязаных з высылкай**, якія фінансаваліся з дзяржаўнага буджэту.

## 5.7 АНУЛЯВАННЕ ДАЗВОЛУ НА ПАСЯЛЕННЕ

**Ануляванне дазволу на пасяленне іншаземца наступае калі:**

1) гэта неабходна па меркаваннях абароны і нацыянальнай бяспекі альбо абароны бяспекі і грамадзянскага ладу альбо інтарэсаў Рэспублікі Польшча;
2) падаў заяву альбо далучыў да яе дакументы з няпраўдзівымі асабовымі данымі альбо няпраўдзівай інфармацыяй;
3) у ходзе працэсу аб выдачы дазволу на пасяленне сведчыў няпраўдзівую інфармацыю альбо затаіў праўду альбо, падрабіў ці перадзелаў дакумент з мэтаю выкарыстаць яго ў якасці сапраўднага, альбо выкарыстоўваў такі дакумент як сапраўдны;
4) быў асуджаны выракам, які ўступіў у законную сілу ў Рэспубліцы Польшча за наўмыснае злачынцтва на тэрмін пазбаўлення волі не меньш 3 гадоў;
5) пакінуў на пастаянна тэрыторыю Рэспублікі Польшча.

## 5.8 ТЭРМІН НА ЯКІ ВЫДАЕЦЦА ДАЗВОЛ НА ПАСЯЛЕННЕ

Дазвол на пасяленне выдаецца на **нявызначаны** тэрмін.

Дакументам, які пацвярджае атрыманне дазволу на пасяленне з’яўляецца **від на жыхарства выдаваны на 10 гадоў**.

Дазвол на пасяленне заканчваецца ў сілу закона ў дзень атрымання іншаземцам дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС.

**РАЗДЗЕЛ VI**

## ДАЗВОЛ НА ДОЎГАТЭРМІНОВАЕ ЗНАХОДЖАННЕ РЭЗУДЭНТА ЕС

**Дазвол** на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС **выдаецца** на заяву іншаземцы, які знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча, **непасрэдна перад падачай заявы, легальна і бесперапынена, мінімум праз 5 гадоў,** які валодае:

- **стабільнымі і рэгулярнымі даходамі** дастатковымі да пакрыцця выдаткаў на ўтрыманне сябе і членаў сям'і, якія знаходзяцца на ўтрыманні іншаземца;
- **медыцынскім страхаваннем** ў адпаведнасці з палажэннямі аб забяспячэнні медычнай апекі фінансаванай за кошт дзяржаўных сродкаў альбо пацвярджэнне страхаўшчыка пакрыць выдаткі на лячэнне на тэрыторыі Рэспублікі Польшча.

## 6.1 УСТАНОВА, ЯКАЯ ВЫНОСІЦЬ РАШЭННЕ

Рашэнне аб прызнанні дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС выдае адпаведны **ваяводы** па месцу жыхарства іншаземца. Заява аб выдачы дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС падаецца на фармуляры.

## 6.2 ДАКУМЕНТЫ

Іншаземец абавязаны:

- прадставіць **дзейны падарожны дакумент**. У асабліва абгрунтаваных абставінах, калі іншаземец не валодае дзейным падарожным дакументам і не мае магчымасці атрымаць яго, можа прадставіць іншы дакумент пацвярджаючы яго асобу.
- Прадставіць **запоўнены фармуляр заявы** і далучыць да заявы:
  - **4 актуальныя фатаздымкі -** непашкоджаныя, каляровыя, з памерамі 35x45 мм, зробленыя на працягу апошніх 6 месяцаў на ясным фоне, з добраю вастрынёю, і на якім выразна віднеюць вочы і твар ад верхняй часткі галавы да верхняй часткі плеч, каб твар займавала 70-80 % фатаздымку; на фатаздымку асоба павінна быць прадстаўлена без галаўнога ўбору і цёмных акуляраў, глядзець перад сабой з адкрытымі вачыма, не закрытымі валасамі, з натуральным выразам твары і закрытым ротам;
  - **дакументы, неабходныя да пацвярджэння даных якія замешчаны ў заяве** і абставіны, якія абгрунтоўваюць падачу заявы на выдачу дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС;
  - **пасведчанне аплаты дзяржаўнага збору;**
  - **права на жыллё**, дзе іншаземец знаходзіцца альбо мае намер знаходзіцца. **За права на жыллё**, дзе іншаземец знаходзіцца альбо мае намер знаходзіцца, **не лічыцца дагавор прадстаўлення ў распараджэнне жылля**, хіба што асобаю якая прадстаўляе жыллё з'яляецца член сям'і па зыходняй альбо ўзыходняй лініі першай ступені, альбо муж/жонка, бацькі мужа/жонкі альбо брат/сястра іншаземца.

## 6.3 ДАДАТКОВЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ЗАЯВЫ

Іншаземец можа падаць заяву на выдачу дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС на працягу **згоднага з правам пражывання** на тэрыторыі Рэспублікі Польшча.

Калі іншаземец падаў заяву на працягу згоднага з правам пражывання на тэрыторыі Рэспублікі Польшча і не існуе фармальных недахопаў альбо фармальныя недахопы былі дапоўнены ў вызначаным тэрміне, ваявода ставіць у падарожным дакуменце іншаземца **штамп**, пацвярджаючы падачу заявы аб выдачы дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС. Адначасова на працягу выконвання вышэйпамянутых дзеянняў, **знаходжанне іншаземца на тэрыторыі Польшчы лічыцца легальным да даты выдачы канчатковага рашэння па справе дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС**.

Калі **працэс** па справе прызнання дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС будзе **прыпынены на заяву іншаземца**, яго **пражыванне** ў гэтым часе **лічыцца нелегальным**

**УВАГА:**
**Штамп у падарожным дакуменце не дае права іншаземцу да паездак па тэрыторыі іншых дзяржаў Шэнгенскага пагаднення, але іншаземец можа паехаць да краю паходжання.**

## 6.4 ПАКІДАННЕ ЗАЯВЫ БЕЗ РАЗГЛЯДУ

**Заява па прызнанню дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС** застаецца без разгляду, калі іншаземец:

- знаходзіцца **за мяжой**;
- знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча **нелегальна**;
- знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча на падставе Шэнгенскай візы ўпаўнаважваючай толькі да ўезду і знаходжання на тэрытрыі Рэспублікі Польшча з мэтаю, аб якой гаворыцца **ў арт. 26, ч. 1, п.**

**26** Закона аб іншаземцах, г.з. з мэтаю ўезду па гуманістычных матывах, у сувязі з інтарэсам дзяржавы альбо ў сувязі з міжнароднымі абавязацельствамі;

- знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча на падставе дазволу на часовае пражыванне аб якім гаворыцца ў **арт. 53а, ч. 2** Закона аб іншаземцах, у выпадку нелегальнага знаходжання на тэрыторыі РП альбо
- затрыманы, **размешчаны ў ахоўным аб'екце**, у ізалятары часовага ўтрымання з мэтаю высылкі, у дачыненні да якога былі прыняты превентыўныя меры як - забарона пакідаць межы краю альбо пазбаўленне волі з прычыны выканання рашэнняў выдадзеных на падставе візы
- знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча **з мэтаю прафесійнага навучання**,
- **валодае дазволам на талераванае пражыванне**, **палітычны прытулак, статус бежанца нададзены ў Рэспубліцы Польшча альбо карыстае з дадатковай альбо часовай абароны,**
- **хадайнічае аб прызнанні статуса бажанца альбо палітычнага прытулка**,
- з'яўляецца працоўнікам **„au pair",** сезонным рабочым, дэлегаваным праз прадаўца паслугаў з мэтаю аказання трансгранічных паслуг альбо з'яўляецца прадаўцом паслугаў які аказвае трансгранічныя паслугі, а таксама
- знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча на падставе дазволу на часовае пражыванне дадзенага на падставе **арт. 53, ч. 1, п. 5 альбо 7 альбо на падставе арт. 53а, ч. 1, п. 1 літ. «а»** Закона аб іншаземцах,

а таксама

- **заява заключаючае фармальныя недахопы, гэта значыць калі:**
  - незапоўнена ўсе неабходныя графы заявы;
  - не прадстаўлен дзейны падарожны дакумент альбо ў асабліва абгрунтаваных выпадках калі іншаземец не валодае дзейным падарожным дакументам і не мае магчымасці яго атрымаць – іншы дакумент, пацвярджаючы асобу іншаземца;
  - не далучана да заявы:
    - 4 актуальныя фатаздымкі;
    - права на жыллё ў неабходных выпадках

## 6.5 АСОБЫ, ЯКІЯ НЕ МОГУЦЬ АТРЫМАЦЬ ДАЗВОЛ НА ДОЎГАТЭРМІНОВАЕ ЗНАХОДЖАННЕ РЭЗУДЭНТА ЕС

**Дазвол на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС не можа быць нададзены іншаземцу, які:**

1. знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча **з мэтаю прафесійнага навучання;**
2. **валодае дазволам на талераванае пражыванне**, **палітычны прытулак, статус бежанца** нададзены ў Рэспубліцы Польшча альбо карыстае з дадатковай альбо часовай абароны;
3. **хадайнічае аб прызнанні статуса бажанца альбо палітычнага прытулка**;
4. з'яўляецца працоўнікам **„au pair",** сезонным рабочым, дэлегаваным праз прадаўца паслугаў з мэтаю аказання трансгранічных паслуг альбо з'яўляецца прадаўцом паслугаў які аказвае трансгранічныя паслугі;
5. знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча на падставе Шэнгенскай візы ўпаўнаважваючай толькі да ўезду і знаходжання на тэрытрыі Рэспублікі Польшча з мэтаю, аб якой гаворыцца ў **арт. 26, ч. 1, п. 26,** альбо дазволу на часовае пражыванне дадзенага на падставе **арт. 53, ч. 1, п. 5 альбо 7 альбо на падставе арт. 53а, ч. 1, п. 1 літ. «а»** Закона аб іншаземцах;
6. затрыманы, **размешчаны ў ахоўным аб'екце**, у ізалятары часовага ўтрымання з мэтаю высылкі, у дачыненні да якога былі прыняты превентыўныя меры як - забарона пакідаць межы краю альбо пазбаўленне волі з прычыны выканання рашэнняў выдадзеных на падставе візы.

## 6.6 ПАТРАБАВАННЕ 5-ГАДАВОГА ЛЕГАЛЬНАГА І БЕСПЕРАПЫННАГА ПРАЖЫВАННЯ

Да тэрміна **5 гадовага знаходжання,** на падставе якога выдаецца дазвол на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС **не залічваецца** знаходжанне іншаземца:

1. затрыманага**, размешчанага ў ахоўным аб'екце**, у ізалятары часовага ўтрымання з мэтаю высылкі, у дачыненні да якога былі прыняты превентыўныя меры як - забарона пакідаць межы краю альбо пазбаўленне волі з прычыны выканання рашэнняў выдадзеных на падставе візы;
2. які з'яўляецца працоўнікам **„au pair",** сезонным рабочым, дэлегаваным праз прадаўца паслугаў з мэтаю аказання трансгранічных паслуг альбо з'яўляецца прадаўцом паслугаў які аказвае трансгранічныя паслугі;
3. які знаходзіцца на падставе Шэнгенскай візы ўпаўнаважваючай толькі да ўезду і знаходжання на тэрытрыі Рэспублікі Польшча з мэтаю, аб якой гаворыцца ў **арт. 26, ч. 1, п. 26,** візы выдадзенай з мэтаю навучання, альбо дазволу на часовае пражыванне дадзенага на падставе **арт. 53, ч. 1, п. 5 альбо 7 альбо на падставе арт. 53а, ч. 1, п. 1 літ. «а» альбо ч. 2;**
4. які з'яўляецца **кіраўніком, супрацоўнікам дыпламатычнай місіі**, кіраўніком консулярнай установы і супрацоўнікам консульскага персаналу іншай дзяржавы альбо іншаю асобаю, якая

валодае такім самым статусам, на падставе законаў, дагавораў альбо агульнапрызнаных міжнародных звычаяў.

**Да тэрміна 5 гадовага знаходжання, на падставе якога выдаецца дазвол на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС залічваецца палова тэрміна знаходжанне іншаземца:**

1. на падставе візы выдадзенай з мэтаю **навучання ў вышэйшай навучальнай установе альбо прафесійнага навучання** альбо
2. на падставе дазволу на часовае пражыванне дадзенага на падставе **арт. 53, ч. 1, п. 1 літ. «b»** Закона аб іншаземцах (навучанне альбо прафесійнае навучанне).

## 6.7 ПАТРАБАВАННЕ БЕСПЕРАПЫННАГА ПРАЖЫВАННЯ – АБГРУНТАВАННЕ ПЕРАПЫНКАЎ У ПРАЖЫВАННІ

Знаходжанне на тэрыторыі Рэспублікі Польшча лічыцца **бесперапынным**, калі не было перапынкаў у пражыванні даўжэйшых ад **6 месяцаў** і ў агульнай складальнасці яны не перавышаюць **10 месяцаў**, акрамя наступных выпадкаў:

- **прычынаю перапынкаў было выкананне прафесійных абавязкаў** альбо выконванне працы за межамі Рэспублікі Польшча, на падставе працоўнага дагавора з працаўцам, галоўны офіс якога знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча;
- **прычынаю перапынкаў было спадарожнічанне разам з мужам/жонкай** ў выконванні прафесійных абавязкаў альбо працы ў абставінах прадстаўленых у п. 1;
- **прычынаю перапынкаў было лячэнне іншаземца**.

## 6.8 АДМОВА Ў ВЫДАЧЫ ДАЗВОЛУ НА ДОЎГАТЭРМІНОВАЕ ЗНАХОДЖАННЕ РЭЗУДЭНТА ЕС

**Іншаземец атрымлівае адмову ў выдачы дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС, калі:**

1. не выконвае патрабаванняў, аб якіх гаворыцца ў арт. 65, ч. 1;
2. гэта неабходна па **меркаваннях абароны і нацыянальнай бяспекі** альбо абароны бяспекі і грамадзянскага ладу.

## 6.9 АНУЛЯВАННЕ ДАЗВОЛУ НА ДОЎГАТЭРМІНОВАЕ ЗНАХОДЖАННЕ РЭЗУДЭНТА ЕС

**Ануляванне дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС іншаземца наступае калі:**

1. **атрыманне дазволу** на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС **адбылося не згодна з законам**;
2. прадстаўляе рэальную і сур'ёзную **пагрозу** для абароны і нацыянальнай бяспекі альбо бяспекі і грамадзянскага ладу;
3. **пакінуў тэрыторыю Рэспублікі Польшча** на тэрмін даўжэйшы чым **6 гадоў**;
4. **пакінуў тэрыторыю Еўрапейскага Саюза** на тэрмін паслядоўнах **12 месяцаў**;
5. **атрымаў на тэрыторыі іншай дзяржавы-члены** Еўрапейскага Саюза **дазвол на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС**.

## 6.10 ПАЎТОРНАЕ АТРЫМАННЕ ДАЗВОЛУ НА ДОЎГАТЭРМІНОВАЕ ЗНАХОДЖАННЕ РЭЗУДЭНТА ЕС

У выпадку калі дазвол на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС быў ануляваны па прычынах, аб якіх гаворыцца ў **арт. 69, ч. 1, п. 3-5** Закона аб іншаземцах, паўторны дазвол на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС выдаецца іншаземцу, які выконвае патрабавання прадстаўленыя ў арт. 65, акрамя таго непасрэдна перад падачаю заявы аб выдачы наступнага дазволу павінен **знаходзіцца легальна і бесперапынна на тэрыторыі Рэспублікі Польшча на працягу мінімум 3 гадоў.**

## 6.11 ТЭРМІН НА ЯКІ ВЫДАЕЦЦА ДАЗВОЛ НА ДОЎГАТЭРМІНОВАЕ ЗНАХОДЖАННЕ РЭЗУДЭНТА ЕС

Дазвол на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС выдаецца на **нявызначаны** тэрмін**.**
Дакументам, які пацвярджае атрыманне дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС з'яўляецца **від на жыхарства выдаваны на 5 гадоў**.

Дазвол на пасяленне заканчваецца ў сілу закона ў дзень атрымання іншаземцам дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС.

**РАЗДЗЕЛ VII**

## ВІД НА ЖЫХАРСТВА

### 7.1 АГУЛЬНЫЯ ЗВЕСТКІ

**Іншаземецу, які атрымаў:**

- **дазвол на часовае пражыванне**
- **дазвол на пасяленне**
- **дазвол на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС**
  **- выдаецца від на жыхарства.**

**Від на жыхарства**, на працягу тэрміна яго дзеяння, пацвярджае асобу іншаземца на працягу яго знаходжання на тэрыторыі Рэспублікі Польшча і дае права разам з падарожным **дакументам,** да шматразавага перасякання польскай мяжы без візы.

У выпадку **адсутнасці прапіскі** на часовае пражыванне больш за 2 месяцы, на відзе на жыхарства не падаюцца адрасныя даныя.

Калі на момант выдачы рашэння аб прызнанні дазволу на часовае жыхарства іншаземец знаходзіцца за мяжой, каб уехаць на тэрыторыю Польшчы іншаземец абавязаны хадайнічаць аб выдачы **Шэнгенскай візы з мэтаю рэалізацыі дазволу на часовае пражыванне**
**Від на жыхарства** будзе выдадзены пасля ўезду на тэрыторыю Польшчы праз ваяводу, які выдаў дазвол на часовае пражыванне. Іншаземец абавязаны **сам** атрымаць від на жыхарства, а ў выпадку з малалетнім меньш за 13 гадоў – дакумент атрымлівае яго ўпаўнаважаны прадстаўнік альбо апякун.

**Аплата за выдачу віда на жыхарства выносіць 50 польскіх злотых. Збор уносіцца на рахунак вызначанага ваяводы.**

### 7.2 АБМЕН ВІДА НА ЖЫХАРСТВА

Іншаземец мае абавязак **замяніць від на жыхарства** ў наступных выпадках:

1. змена даных, якія знаходзяцца на відзе на жыхарства;
2. змена знешняга выгляду, які перашкаджвае ўстанавіць яго асобу;
3. від на жыхарства пашкоджаны і перашкаджвае карыстаць з яго;
4. страта альбо пашкоджанне віда на жыхарства;
5. тэрмін дзеяння віда на жыхарства закончыўся ў сувязі з атрыманнем дазволу на пасяленне альбо дазволу на жыхарства доўгатэрміновага рэзідэнта ЕС.

### 7.3 УСТАНОВА ПА АБМЕНУ ВІДА НА ЖЫХАРСТВА

Абмен віда на жыхарства праводзіцца праз **вызначанага ваяводу па месцу жыхарства іншаземца.** Від на жыхарства выдаецца і абменьваецца пасля **аплаты.**

**Заява** па абмену віда на жыхарства падаецца на **фармуляры**. Іншаземец, які хадайнічае аб абмене віда на жыхарства абавязаны **прадставіць дзейны падарожны дакумент і далучыць да заявы:**

1) фатаздымкі асоб, якія ўключаны да заявы, **зробленыя ў адпаведнім фармаце**;
2) **дакументы, неабходныя для пацвярджэння даных** і абставін прадстаўленых у заяве.

У асаблівых абставінах, калі іншаземец, які хадайнічае аб абмене віда на жыхарства не мае і не прадстаўляецца магчымасці атрымаць дзейны падарожны дакумент, можа прадставіць **іншы дакумент, пацвярджаючы яго асобу.**

### 7.4 СТРАТА ВІДА НА ЖЫХАРСТВА

Іншаземец, які **страціў від на жыхарства**, абавязаны паведаміць аб гэтым **ваяводу**, які выдаў яму від на жыхарства, на працягу **3 дзён** ад даты страты. Калі вы знайшлі страчаны від на жыхарства, то на працягу 3 дзён ад даты яго знаходжання паведаміць аб гэтым ваяводу і звярнуць адразу знойдзены від на жыхарства, калі быў ужо выдадзены новы від на жыхарства.

Іншаземец абавязаны **вярнуць адразу від на жыхарства** да ўстановы, якая яму яго выдала – пасля атрымання дакумента, пацвярджаючага **набыццё польскага грамадзянства** альбо рашэння аб адмове дазволу на часовае пражыванне, дазволу на пасяленне альбо дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС.

## 7.5 ПАДАРОЖНІЧАННЕ НА ПАДСТАВЕ ВІДА НА ЖЫХАРСТВА

**Іншаземец можа падарожнічаць і знаходзіцца на тэрыторыі дзяржаў Шэнгенскай прасторы** (таксама на тэрыторыі Рэспублікі Польшча) **без неабходнасці атрымання візы на працягу тэрміна, які не перавышае 3 месяцаў на працягу 6 месяцаў** на падставе дазволу на пражыванне, выдадзенага праз адну з дзяржаў Шэнгенскай прасторы, **у выпадку Польшча – віда на жыхарства.** Пры гэтым іншаземец павінен выконваць наступныя ўмовы ўезду і знаходжання на тэрыторыі дзяржаў Шэнгенскай прасторы:

- валодаць **дзейным падарожным дакументам**,
- можа **абгрунтаваць мэту і абставіны планаванай паездкі,**
- валодаць **неабходнымі сродкамі** на жыццё альбо магчымасцю іх атрымання ў згодзе з законам, а таксама
- **не з'яўляецца асобаю, каторая прадстаўляе пагрозу для грамадзянскага ладу**, унутранай бяспекі, грамадзянскага здароў'я альбо міжнародных адносінаў дзяржаў Шэнгенскай прасторы, і не знаходзіцца ў спіску грамадзян, каторым адмоўлены ўезд на тарэторыю гэтых дзяржаў.

**<u>Дзяржавы Шэнгенскай прасторы:</u>** Аўстрыя, Бельгія, Данія, Фінляндыя, Францыя, Грэцыя, Іспанія, Люксембург, Нідэрланды, Германія, Партугалія, Швецыя, Італія, Эстонія, Літва, Латвія, Мальта, Польшча, Чэхія, Славакія, Славенія, Венгрыя, а таксама Швейцарыя, Нарвегія і Ісландыя (апошнія 3 дзяржавы не належаць да ЕС, але належаць да Шэнгенскай прасторы).

**Трэба падкрэсліць, што: Вялікабрытанія, Ірландыя, Кіпр, Балгарыя і Румынія з'яўляюцца дзаржавамі-членамі ЕС, але не належаць да дзяржаў Шэнгенскай прасторы**

## РАЗДЗЕЛ VIII
## АПЕЛЯЦЫЙНАЯ ПРАЦЭДУРА

Бок, незадаволены рашэннем адпаведнага ваяводы, выдадзенага па справе: дазволу на часовае пражыванне / дазволу на пасяленне / дазволу на доўгатэрміновае знаходжанне рэзудэнта ЕС / прадаўжэння візы / абмена віда на жыхарства мае права да падачы **апеляцыі** на працягу законнага тэрміна **14 дзён ад даты даручэння рашэння** да вышэйшай установы, якою ў вп. справах з'яўляецца **Кіраўнік Ўстановы па справах Іншаземцаў**.

**Апеляцыя падаецца да Кіраўніка Ўстановы па справах Іншаземцаў праз ваяводу, які выдаў рашэнне.** Асоба, каторая падае апеляцыю абавязана пастаіць на ёй **свой подпіс.**

**Апеляцыйная працэдура адбываецца ў згодзе з Агульнымі звесткамі (раздзел II).**

## 8.1 ПРОПУСК ТЭРМІНА

У выпадку пропуска тэрміна падачы апеляцыі іншаземец **на працягу сямі дзён** ад даты спынення прычыны пропуска тэрміна можа **хадайнічаць аб паўторным прызнанні гэтага тэрміна**. Іншаземец абавязаны **абгрунтаваць, што пропуск тэрміна адбыўся без яго віны**. **Адначасова з падачай хадайніцтва неабходна падаць апеляцыю.**

## 8.2 АЗНАЯМЛЕННЕ З МАТЭРЫЯЛАМІ СПРАВЫ

Калі вы хочаце азнаёміцца з матэрыялямі справы бок альбо ўпаўнаважаны прадстаўнік павінен **скантактавацца праз тэлефон** з сакратарыятам Аддзялення па Справах Апеляцыі, Дэпартамента Легалізацыі Пражывання, Установы па Справах Іншаземцаў - **тэл. (22) 60 175 14**, з мэтаю ўстанаўлення дакладнага тэрміна з'яўлення ў Пункце Абслугі Іншаземцаў, Установы па Справах Іншаземцаў па адрасу: **Варшава, вул. Таборова 35 *[*Warszawa, ul. Taborowa 33*]*.**

**Інфармацыя па справах азнаямлення з матэрыялямі справы прадстаўляецца ў рабочыя дні, акрамя серады, ад 10.00 да 15.00 гадзін.**

## 8.3 СПОСАБЫ ПАДАЧЫ ЗАЯВАЎ, ДАКУМЕНТАЎ, АБГРУНТАВАННЯЎ, ПАСВЕДЧАННЯЎ

**ДАКУМЕНТЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ:**

- **арыгіналамі альбо копіямі, пацверджанымі праз установу як дакладная копія. Іншаземец можа пацвярдзіць копію дакумента ў Офісе Падачы Дакументаў Установы па Справах Іншаземцаў:** 00–564 Варшава, вул. Кошыкова 16 *[00–564 Warszawa, ul. Koszykowa 16]*; ад 8.15 да 16.00 гадзін.
- пераведзяны **на польскую мову** польскім прысяжным перакладчыкам.

**Дакументы (заявы, абгрунтавання, пасведчання) можна таксама падаваць:**

- **на пошце на адрас 00–564 Варшава, вул. Кошыкова 16 *[00–564 Warszawa, ul. Koszykowa 16]*.**

- **Непасрэдна ў Офісе Падачы Дакументаў Установы па Справах Іншаземцаў:** 00–564 Варшава, вул. Кошыкова 16 *[00–564 Warszawa, ul. Koszykowa 16]*; ад 8.15 да 16.00 гадзін.

## 8.4 СКАРГА

Бок можа падаць скаргу на рашэнне Кіраўніка Ўстановы па Справах Іншаземцаў да **Ваяводскага Адміністрацыйнага Суда ў Варшаве**, на працягу 30 дзён ад даты ўручэння рашэння. **Бок падае скаргу праз Кіраўніка Ўстановы па Справах Іншаземцаў.**

**Падача скаргі да Ваяводскага Адміністрацыйнага Суда ў Варшаве на канчатковае рашэнне не легалізіруе знаходжання іншаземца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча**.

**Пасведчанне**

***Я атрымаў /ла на ....................................... мове навучанне для іншаземцаў.***

............................................................ ..........................................................................................

(месца, дата) подпіс заяўніка альбо ўпаўнаважанага прадстаўнка

...................................................................

*магчымы подпіс перакладчыка*